Камуністычная партыя (бальшэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 288 (5121)
СНЕЖНЯ
24
ПАНЯДЗЕЛАК
1934 г.
год выдання XVI

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

АБ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ ГАДАВІНЫ АДОЗВЫ ЦК ВКП(б) АБ ХАРЧОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б

1. Гадавіну гістарычнай Адозвы ЦК ВКП(б) ад 22 снежня 1933 г. аб харчовых прадпрыемствах адзначыць правядзеннем партыйна, пачынаючы з 22-XII 1934 г. на ўсіх харчовых прадпрыемствах БССР уп. Наркамхарчпрома, Наркамміносцпрома, Белкаапсаюза, Белхарчпромсаюза, інвалідная кааперацыя, усіх грамадскіх арганізацый.

2. Не адкрытых партыйных сходах абгаварыць справаздачы агляднага камісій па выніках агляду харчовых прадпрыемстваў, па рэалізацыі адозвы ЦК ВКП(б), рашэння Бюро ЦК ад 9 мая па харчовых прадпрыемствах і распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па дальнейшаму паляпшэнню якасці прадукцыі, пашырэнню асартыменту і знешняга афармлення прадукцыі.

3. Прапанаваць горкамам КП(б)Б на бліжэйшым пасяджэнні бюро ГК і РК заслухаць справаздачы гарадскіх, раённых агляднага камісій аб выкананні адозвы ЦК ВКП(б) і рашэння Бюро ЦК КП(б)Б ад 9 мая 1934 г.

4. Усе справаздачныя матэрыялы агляднага камісій з рашэннямі партсходаў прадпрыемстваў бюро горкамам не пазней 1 студзеня 1935 г. прадставіць у Промаддзел ЦК.

5. На Бюро ЦК заслухаць даклад аб выніках агляду на прадпрыемствах БССР.

Аб выніках лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б)

Рэзалюцыя пленума ЦК КП(б)Б сумесна з сакратарамі РК КП(б)Б, начальнікамі палітаддзелаў МТС ад 9-XII 1934 г.

1. Пленум ЦК КП(б)Беларусі вялікі і поўнасцю ўхваляе ўсе рашэнні лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б), маючыя выключнае гістарычнае значэнне для далейшага соцыялістычнага будаўніцтва, для паляпшэння снабжэння гарадоў і сельскіх раёнаў, для лепшага задавалення запатрабаванняў насельніцтва, для далейшага паляпшэння якасці ўсёй нашай работы ў горадзе і вёсцы.

Прынятае пленумам ЦК ВКП(б) важнейшае рашэнне аб адмене з 1 студзеня 1935 г. картачнай сістэмы снабжэння насельніцтва хлебам і некаторымі іншымі прадуктамі і ўстанаўленне па ўсёй краіне шырокага продажу гэтых прадуктаў з дзяржаўных і кааператыўных магазінаў стала магчымым дзякуючы рэалізаванню перамогам у галіне індустрыялізацыі краіны і соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, атрыманым нашай ленінскай партыяй пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК і вялікага Сталіна ў барацьбе супроць ворагаў рабочага класа і іх агентаў-апартуністаў усіх масцей.

Цяпер калгасны лад у нашай краіне пераможна замацаваны, беспаваротна; калгасы і саўгасы ўмацаваліся і дзякуючы гэтаму пролетарская дзяржава мае ў сваіх руках дастатковую колькасць хлеба, каб без картак поўнасцю забяспечыць насельніцтва хлебам шляхам паўсяменнага разгортвання шырокага хлебнага гандлю. У гэтых умовах «картачная сістэма на хлеб і некаторых іншых прадуктах можа быць толькі тормазам у паляпшэнні снабжэння і таму павінна быць адменена. Адмена картачнай сістэмы на хлеб будзе зроблена новы важнейшы крок да замены сістэмы цэнтралізаванага размеркавання разгорнутым савецкім гандлем у адпаведнасці з дырэктывамі аб другім пяцігадовым плане, прынятымі на XVII партыйнай канферэнцыі».

«Ліквідацыя картачнай сістэмы на хлеб і некаторых іншых прадуктах і паўсямесны пераход да шырокага хлебнага гандлю па адзіных дзяржаўных цэнах, а таксама безумоўная магчымасць у далейшым дадатковага зніжэння гэтых цэн і разам з тым зніжэння цэн на прамысловы тавар стварае спрыяючыя ўмовы для далейшага добрабыту рабочых і сялянскіх мас».

Пленум ЦК КП(б)Беларусі асабліва падкрэслівае агромаднае значэнне рашэнняў лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б) для далейшага бурнага росту і росквіту соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР і яго неадлучнай часткі — Савецкай Беларусі. Адмена картачнай сістэмы на хлеб і некаторыя іншыя прадукты з'яўляецца адным з магутных вагароў для разгортвання тавараабароту, умацавання савецкага рубля і ўсёй грашовай гаспадаркі, што ў сваю чаргу з'яўляецца рэальнай базай для правядзення палітыкі зніжэння цэн, арасчання магчымасці спекуляцыі, забяспечвае рост рэальнай заработнай платы рабочых і служачых, яшчэ больш ўздым матэрыяльнага добрабыту калгасных і працоўных мас і далейшае ўмацаванне саюза рабочых і сялян.

2. Пленум ЦК КП(б)Беларусі па стаўляе:

а) Зацвярджаць мерапрыемствы бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР (па падрыхтоўцы практычнага ажыццяўлення рашэнняў пленума ЦК ВКП(б) аб адмене хлебных картак і адкрыцці паўсямеснага гандлю хлебам у БССР, у прыватнасці аб пабудове па лініі дзяржгандлю і спажыўкааперацыі да 1 студзеня новых пякарань на 74 тоны сутачнай прадукцыйнасці, расшырэнні сутачнай магутнасці існуючых пякарань далаткова на 150 тон гатовага хлеба і расшырэнні існуючай сеткі гандлю хлебам к 1 студзеня на 330 магазінаў, давёўшы хлебную сетку к 1 студзеня 1935 г. па БССР да 1141 магазіна (у тым ліку спецыялізаваных 411 і ўзорных булачных — 24). Гандлёвая сетка павінна быць разгорнута так, каб працоўны мог купіць хлеб там, дзе яму зручней.

б) Надаючы агромаднае значэнне рабоце па практычнаму ажыццяўленню рашэнняў пленума ЦК ВКП(б), пленум ЦК КП(б)Б ускладае на сакратароў гаркомаў і райкомаў КП(б)Б, старшынь горсаветаў і РВК персанальную адказнасць за правядзенне ўсіх практычных мерапрыемстваў па ажыццяўленню рашэнняў пленума ЦК ВКП(б) (у прыватнасці патрабуе асаблівай увагі паляпшэнню асартыменту выпускаемых хлябоў, выдзяленню і абсталяванню складскіх памяшканняў для мукі, круп, фуражу і т. д.), каб з 1 студзеня 1935 г. быў забяспечан бесперабойны продаж хлеба ў кожным горадзе, раёне, прыгарадзе, пасёлку, леспрамгасе і т. д.

в) Абавязаць РК КП(б)Б, РВК і профарганізацыі ўдзяліць асаблівую ўвагу падбору кадраў у новаадкрываемыя магазіны, пякарні (загадчыкаў, прадаўцоў, пекароў), каб у магазінах быў забяспечан узорны парадак, чыстата, адсутнасць чаргі. У гэтых мэтах пленум прапануе вярнуць на работу ў хлебныя магазіны і пякарні вопытных загадчыкаў магазінаў, прадаўцоў, пекараў, якія скарыстоўваюцца зараз не па спецыяльнасці, а таксама ўмацаваць гандлёвую сетку праверанымі комуністамі і комсамольцамі. Даручыць бюро ЦК распрацаваць практычныя мерапрыемствы па пытанню падбору і падрыхтоўкі адпаведных кадраў.

Пленум папярэджвае ўсе арганізацыі, што непрадастаўленне памяшканняў пад магазіны, спасыланні на недахват і адсутнасць будматэрыялаў для будаўніцтва і рамонту пякарань і магазінаў не павінны мець месца пры правядзенні даннага рашэння і прапануе бюро ЦК разглядаць такога роду факты, як праяўленне апартуністычных адносін да практычнага ажыццяўлення рашэнняў пленума ЦК ВКП(б).

г) ЦК асоба ўказвае ўсім наркаматам, дырэктарам трэстаў і прадпрыемстваў, кіраўнікам чыгунак і воднага транспарту і кіраўнікам сампромкааперацыі БССР, што рашэнне пленума ЦК ВКП(б), узмацняючы значэнне заработнай платы, як асноўнага вагара павышэння прадукцыйнасці працы, выканання вытворчых планаў, павышэння якасці прадукцыі — абавязвае іх з яшчэ большай энергіяй эмагацца за ажыццяўленне гістарычных шасці ўмоў таварыша Сталіна—канчаткова дасягнуць і абазлічку, яшчэ больш узмацніць свае клопаты аб матэрыяльна-бытавых і культурных патрэбах рабочых. У прыватнасці, пленум ЦК КП(б)Б прапануе ўсім гаспадарчым наркаматам, ЦКПСБ, дырэктарам прадпрыемстваў і парткомам узмацніць работу па ўмацаванню ўласнай харчовай базы прадпрыемстваў і індывідуальных рабочых агародаў і правесці старанную падрыхтоўку іх да веснавой сяўбы 1935 года.

Пленум даручае бюро ЦК і проф арганізацыям забяспечыць правільнае правядзенне ў жыццё прадугледжанага рашэннем ЦК ВКП(б) павышэння заработнай платы рабочым і служачым, і асоба падкрэслівае недапушчальнасць нават-б там не было самавольнага павышэння заработнай платы рабочым і служачым, адкрытага і замаскаванага, і прапануе бюро ЦК і СНК прыцягваць да найстражэйшай адказнасці ўсіх парушаючых гэта важнейшае ўказанне СНК СССР і ЦК ВКП(б).

д) Пленум асоба ўказвае ўсім партыйным і совецкім арганізацыям, што, «пакідаючы ў моцы ўстаноўлены парадак для калгаснага гандлю, неабходна весці няўхільную барацьбу з усякімі спробам спекуляцыі хлебам і іншымі вылазкамі класавага ворага пры правядзенні гэтага важнейшага мерапрыемства».

Пленум абавязвае ўсе ГК і РК КП(б)Б арганізаваць шырокае растлумачэнне сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў-ільнаводаў тых перавагаў, якія стварацца для далейшай вытворчасці ільну ў БССР адменай атаварвання хлебам і ўстанаўленнем апошняй пастановай урада новых загатоўчых цэн на лён у 1935 г.

Пленум абавязвае партыйныя арганізацыі ільняных раёнаў забяспечыць бесперабойны продаж хлеба і мукі на вёсцы.

Партарганізацыі павінны на гэтай аснове мабілізаваць усе калгасы, калгаснікаў, аднаасобнікаў-ільнаводаў на своечасовае і поўнае выкананне сваіх абавязацельстваў па здачы ільну дзяржаве ў бліжэйшым годзе.

е) У сувязі з агромадным значэннем для росту тавараабароту вырабу тавараў шырспажыву пленум даручае бюро ЦК праверыць ход выканання ўказанняў таварыша Сталіна, даных на XVII з'ездзе аб неабходнасці разгарнуць выраб тавараў шырспажыву па ўсіх гаспадарчых наркаматах БССР.

***

3. Пленум ЦК КП(б)Б, ухваляючы рашэнне ЦК ВКП(б) «Аб палітаддзелах у сельскай гаспадарцы», адзначае, што агромадныя поспехі, якіх дасягнуў увесь СССР і ў прыватнасці БССР у галіне сельскай гаспадаркі за апошнія два гады, з'яўляюцца несумненным результатам агромаднага паляпшэння работы нашай партыі на вёсцы.

У гэтых дасягненнях у галіне сельскай гаспадаркі ў БССР агромадную ролю адыгралі створаныя партыяй таксама і ў БССР палітаддзелы МТС і саўгасаў.

Пленум адзначае, што абсалютная большасць пасланых у палітаддзелы МТС Беларусі таварышоў, таксама як і ва ўсім СССР, цалкам апраўдалі давер'е партыі і выканалі ўскладзеныя на іх партыяй ударныя задачы.

4. У цяперашні час у сувязі з ускладненнем і расшырэннем нашых задач на вёсцы ў поўнай меры наспела неабходнасць пераўтварэння палітаддзелаў МТС у звычайныя партыйныя органы шляхам зліцця палітаддзелаў МТС з існуючымі РК партыі або з нова-ствараемымі ў новых раёнах райкомамі. Пленум не сумняваецца, што гэта пераўтварэнне і звязанае з ім увядзенне ў буйных сельскагаспадарчых раёнах пасады другога сакратара, стварэнне ў райкомах сельгасаддзелаў, пакіданне на работе ў раёнах «усіх, без выключэння, наяўных работнікаў палітаддзелаў»—несуць ненна яшчэ больш узмоцніць работу нашай партыі па соцыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі БССР, па завяршэнню калектывізацыі, па дасягненню яшчэ больш поспехаў і вытворчых, і культурна-бытавых.

Гэта важнейшае рашэнне пленума ЦК ВКП(б) пастаўлена выключна сур'ёзную і неабходную задачу стабілізацыі кадраў у раёне, знішчэння цякучасці, сур'ёзнага асваення кожным работнікам даручанага яму ўчастка работы.

Пленум ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

а) Даручыць бюро ЦК неадкладна прыступіць да распрацоўкі і правядзення ўсіх рашэнняў, вынесеных пленумам ЦК ВКП(б) Аб арганізацыі новых раёнаў, аб скарыстанні работнікаў палітаддзелаў, аб прадастаўленні на зацвярджанне ЦК ВКП(б) «усіх сакратароў РК партыі,.., а таксама намеснікаў дырэктароў МТС па палітычнай частцы».

5. Пленум ЦК КП(б)Б патрабуе ад гаркомаў, райкомаў, РВК і ўсіх рэспубліканскіх і раённых арганізацый умацнення рэвалюцыйнай пільнасці на ўсіх участках нашай работы ў вёсцы, канчатковага выкарчоўвання маючайся яшчэ ў радзе калгасаў падрыўной шкодніцкай работы пралезшых у іх кулацкіх элементаў.

З прычыны значнага прыліву ў калгасы БССР, меўшага месца ў 1934 годзе, асаблівае значэнне набывае для ўсіх партыйных арганізацый Беларусі правільнае скарыстанне зімовага перыяда для далейшага ўмацавання калгасаў, у асаблівасці для ўсяму адсталых калгасаў, паляпшэння работы сярод калгаснага актыва, арганізацыі культмасавай работы ў калгасах.

Разам з тым пленум ЦК прапануе ўсім партыйным арганізацыям КП(б)Б з асаблівай пільнасцю ў бліжэйшы час намеціць і правесці практычныя меры па далейшаму ўцягненню добрасумленных аднаасобнікаў у калгасы.

Пленум ЦК лічыць адным з цэнтральных пытанняў работы калгасаў зімой пытанне аб далейшым развіцці жывёлагадоўлі (выпрацоўванне і поўнае захаванне малагдняка, стварэнне добрых умоў для зімоўкі жывёлы).

Пленум лічыць, што рашэнні лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б) павінны стаць здабыткам усіх працоўных БССР і магутным вагаром для паспяховага завяршэння ўсіх заданняў партыі і ўрада ў справе «далейшага ўмацавання калгасаў, згуртавання беспартыйнага актыва, паляпшэння работы праўлення і старшынь калгасаў, павышэння ролі і значэння агульных сходаў калгаснікаў, згуртавання іх вакол партыі і далейшага ўмацавання пярэдавой партарганізацыі на вёсцы» (з рэзалюцыі пленума ЦК ВКП(б).

Наша партыя, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК, на чале з любімым і мудрым правадыром таварышам Сталіным, забяспечыла гігантскія перамогі соцыялізма ў нашай краіне. З года ў год Совецкі Саюз мацнее, расце. Разбітыя ў адкрытай барацьбе, ворагі партыі і совецкай улады звяртаюцца да апошняга белабандыцкага фашысцкага сродку барацьбы — гэрору. Гнусная, подлая рука падасланага ворагамі рабочага класа забойцы вырвала з нашых радоў моцнага большэвіка, аднаго з любімейшых правадыроў партыі і рабочага класа таварыша Кірава. Яны нанеслі цяжкі ўдар партыі, але гэты ўдар яшчэ больш згартоўвае нашы рады, яшчэ цясней згуртоўвае нас вакол партыі, да ленінскага ЦК, вакол нашага любімага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна.

Пролетарская дыктатура бязлітасна расправяцца з азвярэлым класавым ворагам, з усімі, хто папрабуе падняць руку на завяванні пролетарскай рэвалюцыі і яе вялікіх правадыроў. Партыя жалезнай рукой скарупыць і контрэвалюцыйныя асколкі раней разгромленых ёю антыпартыйных груп, якія сканцілися ў рады контрэвалюцыі.

Пленум упэўнен, што ўсе члены КП(б)Б, усе рабочыя, калгаснікі, працоўныя аднаасобнікі і ўсе працоўныя БССР з найвялікшым энтузіязмам будуць эмагацца за ажыццяўленне гістарычных рашэнняў лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б), што яны яшчэ больш узмоцняць большэвіцкую рэвалюцыйную пільнасць, барацьбу за выкананне прамфінплана прадпрыемстваў, за баявую вучобу, за далейшае ўмацаванне калгасаў і саўгасаў, за ільнозагатоўкі і хлебазакупкі, за далейшыя перамогі соцыялізма ў нашай вялікай Совецкай краіне, якая эмагаецца пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і геніяльнага правадыра ўсіх працоўных таварыша Сталіна.

СПРАВА ГОНАРУ УСЕЙ БССР

Путарка ідзе аб завяршэнні плана ільнозагатовак. І сапраўды. Наша БССР з поспехам правяла сяўбу, уборку, хлеба і бульбапастаўкі, азімую сяўбу, яблыка. К канцу падыходзяць хлебазакупкі. І БССР змагла-б з законнай гордасцю адзначыць поспехі на ўсіх участках сельскай гаспадаркі, калі-б мы закончылі ільнозагатоўкі.

Для ацэнкі нашай работы лён мае такое-ж рашаючае значэнне, як хлеб для Украіны, Паволжа, Сібіры. А між тым, наша БССР, ідучы першай па Саюзу да Окцябрскіх свят, за апошнія паўтара месяца адкацілася на чацвертае месца. Маскоўская і Іванаўская вобласці ўжо закончылі ільнозагатоўкі. Ленінградская ўжо нас абагнала. Апошнія пяцідзённкі даюць менш процанта кожная.

Чым-жа можна вытлумачыць гэта ганебнае наша таптанне на месцы? Яго можна вытлумачыць тым самаацэнкаваннем, якое прышло ў лістападзе пасля поспехаў верасня-кастрычніка; самасупакаваннем і яго субратам—самацёкам, якія яшчэ не зломлены і зараз. Яго можна вытлумачыць гніла-ліберальнымі адносінамі да фактаў раскрадвання ільну. Характэрна, што асабліва шматлікія факты раскрадвання ільну маюць месца ў Дуброўне, Мсціслаўлі, Чавусах, Горках і т. д., гэта значыць якраз у раёнах, якія зрываюць ільнозагатоўкі. Апартуністычная бяздзейнасць раённых арганізацый, пракуратуры, суда, міліцыі, у першую чаргу в адносінах раскрадвальнікаў калгаснага ільну, прывяла да таго, што ў гэтых раёнах—а гэтыя раёны рашаюць зараз поспех ільнозагатовак па ўсёй БССР—кулацкія элементы здолелі ў радзе калгасаў арганізаваць разбазаранне ільну. Мы пытаемся: што агульнага маюць такія адносіны да ладзеньку і раскрадвальніку з палітыкай нашай партыі? Як ідзе, як не апартуністычным скажэнням лініі партыі, треба кваліфікаваць паводзіны гэтых раённых арганізацый? Трэба неадкладна выпрацаць гэтыя апартуністычныя памылкі. Апіраючыся на калгасны актыў, на калгаснікаў-ударнікаў, мы павінны дабіцца таго, каб лён, які маюць калгасы, быў здан дзяржаве, каб разбазараны лён быў сабран і адпраўлен на здатачны пункт.

Мы ганебна топчамся на месцы, бо рад раёнаў (Чавусы, Рэчыца, Быхаў, Горкі і т. д.), захапіўшыся калгасным прыпівам, забылі аб другім баку справы—аб забеспячэнні справы выканання новымі непгаснікамі іх абавязацельстваў па ільну. Шматлікія сігналы гавораць аб тым, што немалая частка новых калгаснікаў, маючы лён, упляцецца ад ільнозагатовак, выкідае. Неабходна зараз разгарнуць энергічную арганізацыйную работу, рашуча пастаўшы пытанне перад кожным новым калгаснікам аб выкананні ім абавязацельстваў па ільну. Значную ролю можа тут адыграць узаемаправерка выканання кантрактацыйных абавязацельстваў (гэты метад узаемаправеркі треба прымяніць і ў калгасах, і сярод аднаасобнікаў).

Значная частка ільну асела ў адмесасобным сектары. Есць немала аднаасобнікаў, якія гадамі не выконваюць кантрактацыйных абавязацельстваў, адначасова спекулюючы ільном на рынку. Гэтым сабатажнікі ільнозагатовак павінны ўдарыць цвёрдую руку рэвалюцыйнай законнасці.

За апошні час чуўся галасы аб адсутнасці ільну. Асабліва мацны гэтыя разгаворы ў адстаючых раёнах. Факты, прыведзеныя ў «Звязде» за апошнюю дэкаду з Мсціслаўля, Чавус, Дуброўны, Горак, паведамляюць буксірныя брыгады ўпчкент разбіваюць гэтыя нікчемныя спробы апраўдаць уласную бяздзейнасць. Лён ёсць у дастатковай колькасці як у адстаючых раёнах, так і ў раёнах, уже выканаўшых план (апошнія не павінны забываць аб выкананні імі самаабавязацельстваў па ільну). Патрэбна толькі цвёрдая арганізаторская рука, патрэбна найпырэчная растлумачэнне кожнаму калгаснику і аднаасобніку значэння ільнозагатовак для БССР. Патрэбна толькі рашучая крымінальная законнасць у адносінах раскрадвальніку ільну, сабатажніку ільнозагатовак. Няхай ведае кожны РК, палітаддзел, РВК, сельсавет, што партыя і ўрад не дапусцяць невыканання плана ільнозагатовак БССР пазнейш і выканае свае абавязацельствы па ільну не ўсе 100 процантоў.

ВУЧОНЫЯ КРАІНЫ НА ПРЫЁМЕ У тав. МОЛАТАВА

МАСКВА, 23 снежня. (БЕЛТА). 22 снежня ў тав. В. М. Молатава адбыўся прыём вялікай делегацыі ад Акадэміі Навук. У склад гэтай делегацыі ўваходзілі акадэмікі:

А. П. Карпінскі, В. П. Волгін, А. А. Барысяк, В. І. Вернадскі, Ф. Ю. Левінсон-Лесінг, Н. С. Курнакоў, І. М. Губкін, Н. І. Бухарын, С. І. Вавілаў, А. М. Дэборын, А. Ф. Іофе, В. А. Кеппер, В. А. Кісцякоўскі, А. Д. Архангельскі, Г. А. Надсон, А. А. Рыхта, Э. В. Брыцке.

Прыём прадаўжаўся каля трох гадзін. У гутарцы з тав. В. М. Молатавым і старшынёй Дзяржплана тав. В. І. Межлаукам быў адкрыт цэлы рад пытанняў, звязаных з пераездам Акадэміі Навук у Маскву і з выцякаючымі адсюль задачамі Акадэміі. У абмене думак прымалі ўдзел і выступалі амаль усе прысутныя акадэмікі.

У сваім уводным слове неадмінны сакратар Акадэміі тав. В. П. Волгін звярнуўся ад імя Акадэміі з падзякаю да ўрада за тую дапамогу, якая была аказана Акадэміі ў сувязі з пераездам і спыніўся на радзе пытанняў, датычных капітальнага будаўніцтва Акадэміі, яе арганізацыі, у прыватнасці, стварэння ўнутры акадэміі тэхнічнага савета.

Усе выступаўшыя акадэмікі адзначалі ўвогуле спрыяючыя ўмовы размяшчэння акадэмічных устаноў у Маскве.

У разгорнутым абмене думак былі закрануты і хворыя тэмы акадэмічнага жыцця: пытанні аб недастатковай эксперыментальнай базе, аб заграніччнай літаратуры, аб адыходзе жанасці акадэмікаў ненавуковымі абавязкамі, аб асігнаваннях на пасобныя інстытуты, аб кадрах, аб вытворчасці навуковай апаратуры і інструментаў і інш. Рад удзельнікаў нарады спыніліся на бытавых пытаннях і спецыяльна на пытаннях будучага будаўніцтва.

Пасля выступлення акадэмікаў тав. В. І. Межлаук спыніўся на прынцыповым пытанні аб новым твары Акадэміі Навук.

Тав. Межлаук указаў на тое, што спецыфічная асаблівасць Акадэміі, у адрозненне ад любой групы навукова-даследчых інстытутаў наркаматаў, павінна заключацца ў тым, што тут вырашаюцца праблемы больш высокага тэарэтычнага парядку і, па-другое, яны разглядаюцца комплексна. Такім чынам, Акадэмія Навук у сваёй навукова-даследчай рабоце павінна знаходзіцца ў цесным сувязі з Дзяржпланам, які разглядае комплексна пытанні эканамічнага парадку, будучы аператыўным органам СНК.

З рэзюмуючай прамовай выступіў у канцы пасяджэння тав. В. М. Молатаў. Ён рэзка падкрэсліў усё палітычнае і культурнае значэнне пераезду Акадэміі, якое забяспечвае ёй большы размах навуковых работ, больш цесную ўвязку з соцыялістычным будаўніцтвам і, паўтаўшы куды большую блізкасць Акадэміі ix уладу. Ён падкрэсліў далей вострую неабходнасць разгортвання тэарэтычных работ і забеспячэння совецкай навукі належнага гістарычнага месца. На думку тав. Молатава, пры ўсіх заслугах Акадэміі, усё-ж ад яе можна і трэба патрабаваць большага. З гэтага пункту гледжання неабходна, каб 1935 год стаў да поўнай ступені пераломным годам з рэзка выражаным пад'ёмам крывой навуковай прадукцыі ў адпаведнасці з пастаўленымі ўрадам задачамі перад Акадэміяй Навук.

Пераходзячы да пытання аб капітальным будаўніцтве Акадэміі, тав. В. М. Молатаў адзначыў, што ў Акадэміі яшчэ няма дастатковага плана, што яго выпрацоўку треба паскорыць і што ў пятым плане неабходна выдзеліць пошпральны будынак або комплекс будынкаў з тым, каб пачаць будаваць яго ўжо ў 1936 годзе. Тав. Молатаў, адказваючы на пытанні акадэмікаў, абяцаў іншчэ кадрыма мане Акадэміі ў справе дастатковай выдзяленнай базы, у атрымані заграніччнай літаратуры, па ўпарадкаванні некаторых бытавых пытанняў і т. д., фактуча падкрэсліўшы, адначас, асноўныя праблемы ўздыму навуковай работы і абдумванага плана будаўніцтва. У канцы сваёй прамовы ён прапанаваў сабраўшымся представіць канкрэтныя меркаванні па закрадзутых вялікіх пытаннях, як іншыя для рашэння ўрада.

Гэтым завяршаецца выключны цёплым гутаркам тт. Молатава і Межлаука з акадэмікамі, лепшымі вучонымі краіны совецкай.

АРШАНСКАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ ВЫКАНАЛА ГАДАВЫ ПЛАН

ЦК КП(б)Б Т. Т. ГІКАЛО, ВАЛКОВІЧУ,

ЦВК БССР—ТАВ. ЧАРВЯКОВУ,

СНК БССР—ТАВ. ГАЛАДЗЕДУ.

РЭДАКЦЫЯМ ГАЗЕТ «ЗВЯЗДА» І «РАБОЧИЙ».

На аснове барацьбы партыйнай арганізацыі, совецкіх, рабочых, інжынерна-тэхнічнага персанала за права рапарту XI з'езду совецкіх БССР і VII усесаюзнаму з'езду совецкіх гадавы прамфінплан прамысловасцю Аршанскага раёна поўнасцю выкананы на 15 снежня. На 20 снежня выпрацавана прадукцыі на рэспубліканскай, мясцовай і самаатужнай прамысловасці на 45.840.000 руб., што складае 122,2 проц. плана.

Райком КП(б)Б—СОСКІН.

РВК—МІЦЬКОЎ.

Райпрофсавет—ФЕДАРАЎ.

АБ СПІСАННІ З КАЛГАСАЎ ЗАПАЗЫЧАНАСЦІ ПА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ ПАЗЫКАХ, ВЫДАНЫХ ДА 1-га СТУДЗЕНЯ 1933 г.

Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б)

У мэтах далейшага гаспадарчага ўмацавання калгасаў, СНК СССР і ЦК ВКП(б) ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Анулаваць дзяржаўную фінансавую дапамогу калгасам, зняўшы з іх усю, якая лічыцца за імі, запазычанасць па сельскагаспадарчых пазыках Сельска-гаспадарчаму банку, выданых да 1-га студзеня 1933 г., разам з нарахаванымі на гэтыя пазыкі процантамі, у агульнай суме ў 435.639.000 рублёў з наступным размеркаваннем па рэспубліках, краях і абласцях:

(у тыс. руб.).

КАНТОРЫ СЕЛЬГАСБАНКА:	
1. Паўночная	4.435
2. Карэльская	1.918
3. Ленінградская	9.363
4. Заходняя	5.518
5. Маскоўская	16.316
6. Іванаўская	3.893
7. Горкаўская	6.066
8. Свердлоўская	2.506
9. Чэлябінская	6.863
10. Обска-Іртышская	242
11. Башкірская	2.870
12. Татарская	1.981
13. Сярэдне-Волжская	22.459
14. Варонежская	5.625
15. Курская	2.917
16. Саратаўская	17.332
ў тым ліку:	
Рэсп. немцаў Паволжжа	5.512
17. Сталінградская	9.680
18. Азова-Чорнаморская	18.658
19. Паўночна-Каўказская	13.044
ў тым ліку:	
Дагестанская АССР	1.505
20. Крымская	11.748
21. Казакская	19.686
у тым ліку:	
Алма-Аціцкая	4.407
Акцюбінская	3.181
Карагандзінская	3.446
Усходне-Казакская	4.082
Паўднёва-Казакская	3.100
Заходне-Казакская	1.470
22. Кара-Калпакская	1.100
23. Кірэізская	3.927
24. Заходне-Сібірская	25.996
25. Усходне-Сібірская	4.600
26. Далёка-Усходняя	22.589
27. Якуцкая	500
28. Украінская ССР	80.438
у тым ліку:	
Харкаўская вобласць	8.050
Кіеўская	17.007
Чарнігаўская	3.177
Вінніцкая	16.353
Днепрапятроўская	12.132
Одэская	11.281
Данецкая	5.320
Малдаўская АССР	7.118
29. Беларуская ССР	19.702
30. Закаўказская СФСР	28.256
у тым ліку:	
Азербайджанская	3.460
Грузінская	19.947
Армянская	4.849
31. Узбекская ССР	24.118
32. Туркменская ССР	4.958
33. Таджыкская ССР	8.742
Усяго па СССР	415.424
Запазычанасць па напічаных процантах па ўсіх гэтых ссудах	20.215
Разам	435.639

2. Прапанаваць соўнаркомам саюзных і аўтаномных рэспублік, краёвым і абласным выканкамам у шэрах указаных сум для кожнай рэспублікі, края і вобласці зацвярдзіць, па прадстаўленню кантор Сельгасбанка, сумы спісваемай запазычанасці для кожнага калгаса.

3. Абавязаць Наркамфін СССР і Сельскагаспадарчы банк закончыць спісанне названай запазычанасці па кожнаму пасобнаму калгасу не пазней 15 лютага 1935 года, са зваротам кожнаму пасобнаму калгасу аб паведных доўгатэрміновых абавязацельстваў, выданых імі ў свой час Сельгасбанку.

4. Абавязаць Народны Камісарыят фінансаў СССР разам з Наркамземам СССР і Сельскагаспадарчым банкам зацвярдзіць у дэкадны тэрмін інструкцыю аб парадку ажыццяўлення гэтай пастановы.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ.

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)
І. СТАЛІН.

22 снежня 1934 г.

Аб дваццаціпяцігадовай мастацкай дзейнасці заслужанага артыста рэспублікі, мастацкага кіраўніка дзяржаўнага яўрэйскага тэатра М. Ф. Рафальскага

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

Адзначаючы значныя заслугі М. Ф. Рафальскага ў справе будаўніцтва совецкага тэатра ў БССР, Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

Прысвоіць М. Ф. Рафальскаму званне народнага артыста рэспублікі.

Нам. старшыні Совета Народных Камісараў БССР
А. САКТЫН.

Кіраўнік справаў Совета Народных Камісараў БССР
С. ШАБАЛТАС.

22 снежня 1934 г.

ПРАКЛЯЦЦЕ ЗАБОЙЦАМ!

РАБОЧЫЯ ЗАВОДАЎ І ФАБРЫК МАСКВЫ ПАТРАБУЮЦЬ СУРОВАГА ПАКАРАННЯ ПОДЛЫХ ЗДРАДНІКАЎ

МАСКВА, 23 снежня. (БЕЛТА). 22-га снежня на маскоўскіх заводах і фабрыках адбыліся мітынгі, абмяркоўваючыя паведамленне Народнага камісарыята ўнутраных спраў СССР аб скончэнні папярэдняга следства па справе аб забойстве С. М. КІРАВА і перадаваны артыкул «Праўды» ад 22-га снежня.

Ва ўсіх цэхах ТРОХГОРНАЙ МАНУФАКТУРЫ ў ранішнюю змену былі праведзены чытні паведамлення Наркамата ўнутраных спраў аб скончэнні папярэдняга расследавання па справе аб забойстве С. М. КІРАВА і перадавой «Праўды».

— Азнаёміўшыся з паведамленнем Наркамата ўнутраных спраў,— заяўляюць рабочыя Трохгоркі ў сваёй рэзалюцыі,—мы клаймім праклёнамі забойцаў. Павысім сэтэ пролетарскую пільнасць! Распазнаем ворагаў рэвалюцыі, расправімся з імі мячом пролетарскай дыктатуры.

Ва ўсіх цэхах завода «БОРЕЦ» прайшлі многалюдныя мітынгі рабочых і служачых, на якіх горача абмяркоўваліся паведамленне НКУС і перадавая «Праўды».

— Рабочыя, ІТР і служачыя завода «Борец»,—гаворыцца ў прынятай рэзалюцыі,—з глыбокім абурэннем і бясконцай нянавісцю клаймяць ганьбай тройчы праклятыя падонкі разгромленай былой антыпартыйнай групы Зіноўева-Каменева. Пабеданосная шэсця пролетарыяту Савецкага Саюза к социялізму пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) і любімага правадыра т. Сталіна, не спыніць вам, прэзрэнныя падонкі! Жалезныя рады пролетарыята раздавяць гадзін, якія робяць сваю брудную справу. Больш пільнасці!

Цэлай згуртуемся вакол нашай комуністычнай партыі і вялікага мудрага Сталіна! Няма літасці ворагам рабочага класа!

Рабочыя ЗАВОДА «КРАСНЫЙ ПРОЛЕТАРЫЙ» у сваіх выступленнях на ўчарашніх мітынгах патрэбавалі самага суровага пакарання подлым падонкам былой зіноўеўскай апазіцыі, стаўшай на шлях фашысцкага індывідуальнага тэрору.

— Просім Цэнтральны Камітэт партыі правесці самую суровую праверку членаў партыі, якія належалі да зіноўеўскай апазіцыі, і выгнаць тых, хто толькі на словах адмовіўся ад сваіх ранейшых перакананняў, а на справе вядзе падрыўную работу.

З найглыбейшым абурэннем даведаліся рабочыя ЗАВОДА ІМЯ ФРУНЗЕ аб тым, што забойства С. М. Кірава з'явілася справай рук падонкаў былой зіноўеўскай апазіцыі. На мітынгах фрунзенцы патрабуюць ад урада самай жорсткай расправы са здрадніками, якія тэрарыстычнымі актамі пробуюць дэзарганізаваць нашы рады.

2.600 рабочых СТАНКАЗАВОДА ІМЯ ОРДЖАНІКІДЗЕ прымалі ўдзел на мітынгах, прысвечаных абмеркаванню паведамлення НКУС. З прамовамі выступіла 38 чалавек.

Усе выступаўшыя ў адзін голас заяўлялі аб необходнасці пільна ахоўваць жыццё нашых правадыроў, павысіць класавую пільнасць.

Капі сталі вядомы імёны гнусных забойц С. М. Кірава, ва ўсіх цэхах завода «МОСКАБЕЛЬ» адбыліся пятучыя мітынгі. Рабочыя з абурэннем адносіліся да гнусных здрадніка ў рабочага класа.

ЗАДУШЫЦЬ ВАРОЖУЮ ГАДЗЮКУ!

Рэзалюцыя схода рабочых завода „Большэвік"

Гнусныя, каварныя агенты класавага ворага, подлыя падонкі былой зіноўеўскай антыпартыйнай групы вырвалі з нашых радоў тав. Кірава.

У момант, калі наша ленінская партыя пад непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна атрымлівае перамогу за перамогай, калі наша партыя вынесла сваё гістарычнае рашэнне аб адмене картачнай сістэмы на хлеб, падонкі контрэволюцыйных зіноўеўскіх і трацкісцкіх груп паднялі сваю здрадніцкую руку на партыю, на яе пераадоленне барацьбіта.

Асуджаныя нашай партыяй, усім рабочым класам, міжнародным пролетарыятам, контрэволюцыйны трацкізм і былыя зіноўеўскія антыпартыйныя групы самкнуліся в фашысцкімі бандамі тэрарыстаў, прабуючы тэрорам дэзарганізаваць нашы рады, прабуючы перашкодзіць нам у вялікай рабоце па будаўніцтву бясклассавага грамадства.

Але няхай ведаюць усе гэтыя гнусныя забойцы, што наша партыя моцная, што ўвесь рабочы клас, усе калгаснікі і працоўнае сялянства больш чым калі-небудзь яшчэ цясней самкнуць свае ряды вакол нашай партыі, вакол любімага намі правадыра сусветнага пролетарыята таварыша Сталіна.

У адказ на гнуснае злачынства недабітага класавага ворага рабочы калектыў чырвонасцяжнага завода «Большэвік» узвесяцярыць сваю класавую большэвіцкую пільнасць і расцісне ўсіх варожую гадзюку, якая падніміцца на нашым социялістычным шляху.

Выказваючы свой глыбокі гнеў і пратэст супроць разбойніцкага злачынства фашысцкіх контрэволюцыйных былых зіноўеўскіх і трацкісцкіх груп, мы патрабуем ад нашай партыі, ад органаў дыктатуры пролетарыята бязлітасна да канца вытрутчы ўсіх гэтых подлых забойцаў і іх саўдзельнікаў.

Мы патрабуем для ворагаў рэволюцыі і рабочага класа суровага пакарання.

Няхай жыве партыя Леніна-Сталіна, забяспечваючая перамогі ў нашай краіне!

Няхай жыве любімы намі правадыр і настаўнік таварыш Сталін!

НІЯКАЙ ЛІТАСЦІ ДА ВОРАГАЎ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РАДЗІМЫ

Рэзалюцыя сходу рабочых цэха ў завода імя Варашылава

Гнусныя раз'юшаныя агенты класавага ворага, подлыя падонкі былой антыпартыйнай групы вырвалі з нашых радоў ленінскага большэвіка, саратніка вялікага Сталіна, Сяргея Міроныча Кірава.

Антыпартыйная група ішла па шляху двурушніцтва, абману, па шляху скрытай подлай барацьбы супроць партыі і рабочага класа Савецкага Саюза. Разбітыя ў адкрытай бойцы падонкі зіноўеўскай групы прытаіліся і сталі прыбягаць да апошняга белабандыцкага сродку барацьбы — тэрору, і ахвярай іх стаў Сяргей Міроныч.

Мы клаймім ганьбой гнусных забойцаў і патрабуем іх суровага пакарання. Ніякай літасці да ворагаў нашай социялістычнай радзімы! Яшчэ шчыльней згуртуем свае рады вакол партыі Леніна-Сталіна. Вышэй узнімем класавую пільнасць! Пад кіраўніцтвам партыі і правадыра таварыша Сталіна пойдзем к новым баям і перамогам.

25-годдзе тэатральнай дзейнасці М. Ф. РАФАЛЬСКАГА

Прывітанне юбіляру!

МАСТАК РЭВОЛЮЦЫЙНАГА ТЭАТРА

Біяграфія Міхаіла Фадзееві ча Рафальскага своеасаблівая і павучальная.

Што характарызуе Рафальскага як мастака ў дарэвалюцыйныя часы?

Нездавальняючасць мастака, які шукае больш шырокія магчымасці для перадачы са сцэны імкнення да лепшага жыцця чалавецтва. Але гэтыя імкненні тонуць і падаўляюцца лютым ботам самаўладства? Дзе ўжо тут гаварыць аб яўрэйскім тэатры, які тады складаўся з брадячых яўрэйска-нямецкіх труп з нямённым рэпертуарам «Хінке Пінке», «Малкеле салдат», «Рэйзеле дэм Рэбнс» і ўсякіх сілісцкіх «Бар Кохба», які задавольваў густы і патрэбнасці ўсякіх гаспадароў і гаспадарыкаў.

Пасля рэвалюцыі мы бачым Міхаіла Фадзееві ча ў страсным імкненні да стварэння яўрэйскага тэатра, які б узняў культуру яго, з іншым рэпертуарам, з культурным акторам. Гэтыя імкненні пачынаюць ажыццяўляцца толькі пасля Окцябрскага перыяда. Міх. Федзееві ч збірае актораў і стварае тэатр «Унзер Вінкл» у Харкаве. Рэпертуар складаецца з лепшых п'ес яўрэйскіх драматургаў, яўрэйскай і не яўрэйскай класікі, з п'ес, якія маюць прагрэсіўны пачатак, рэвалюцыялізуючыя дзеянні.

Гэта былі гады грамадзянскай вайны, трудныя гады вялікіх пакут і гістарычных перамог пролетарыята.

Але людзкі матэрыял тэатра «Унзер Вінкл» быў сабран з актораў старога яўрэйскага тэатра. Большасць з іх «не па сілах» было перанесці труднасці таго перыяда, многія зацудзіліся па белай булцы і паехалі за граніцу. М. Ф. Рафальскі не палохаўся ўплывам гэтых эмігрантствуючых паплечнікаў.

Мы бачым яго тады працуючым у часцях Чырвонай арміі, у клубах. Матэрыяльныя нястачы яго не пагнулі на той бок барыкад, ён мацна звязаў свой лёс з пролетарыятам, кіруемым ленінскай партыяй. Яшчэ не адгрымелі стрэлы грамадзянскай вайны Савецкая Беларусь пачынае толькі вызваляцца ад крывавых банд беларускіх акупантаў, а Міхаіл Фадзееві ч носіцца з марай аб стварэнні яўрэйскага тэатра з новымі людзьмі, з людзьмі надзейнымі. Але іх трэба, выхаваць. І Міхаіл Фадзееві ч сустракае з запалам пастанову ўрада аб стварэнні яўрэйскай студыі для падрыхтоўкі кадраў будучага дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР. Ён бярэ на сябе ганаровую місію пролетарскай улады, з аграмадным энтузіязмам і энергіяй бярэцца кіраваць гэтым смелым пачынаннем. З рабочых клубаў, на прадпрыемствах, з дзіцячых дамоў ён збірае юнакоў і дзяўчат і ўвозіць іх у Маскву, у сталіцу юнай пролетарскай рэспублікі, каб навучыць іх тэатральнаму мастацтву, накопленаму вякамі.

Міхаіл Фадзееві ч з нястомнай энергіяй б'ецца за стварэнне і выхаванне маладых работ, вышаўшых з пролетарскага асяроддзя, для якіх тэатральная асвета да Окцябра была толькі лятуценнем. Міхаіл Фадзееві ч моцна звязан з партыяй, з пролетарскай грамадскасцю. Ён сваёй творчасцю ўключаецца ў барацьбу за знішчэнне гнятучых астаткаў мінулага.

Вядзецца барацьба з клерыкальным выхаваннем дзяцей і М.Ф. бярэцца мастацкімі сродкамі паказаць гную панурую карціну, усе «метады» клерыкальнага выхавання яўрэйскіх дзяцей; пануры пакой хейдэра, крывыя паламаныя лаўкі і стол, злосны Рэбе, які не размаўляе, а шыпіць, садыстычна густуючы лазанку і кнёнкі, пасылаемыя па адрасу сваіх малалетніх вучняў, заўнуўныя трактаты аб гігіене жанчыны, прышыбленыя дзеці пры адным позірку Рэбе. А ў самым цэнтры сцэны светлая сонечная плямка вясёлай, радаснай вулицы, блакітнага неба вабіць і кліча дзяцей тулы вырвацца з гэтай цемры. «Хейдэр», гэта пахавальны звон для мракабесаў клерыкальнага выхавання.

Уся творчая энергія Міхаіла Фадзееві ча тэго перыяда накіроўваецца на лінію развіцця маладога актора, па лінію мастацкага раскрыцця адзечнага ўціску сінагогі, багачоў і іх прыслужнікаў, бунтуючай беднаты. Адсюль імкненне да новаму прачытаць Перэца ў пастаноўцы «На ланцугу пакуты». Міхаіл Фадзееві ч - клапоціцца аб тым, каб малады актор у яўрэйскім тэатры атрымаў усебаковае выхаванне, каб ён не толькі ўмеў іграць у традыцыйным капоце, але ён патэнцен набыць лёгкасць ігры французскай камедыі. Адсюль з'яўляецца спектакль «Скапен» Мальера. І ў гэтым спектаклі Міхаіл Фадзееві ч расшырае рамы і ўносіць сучаснае гучанне.

З года ў год, удасканальваючыся і накапляючы ўсё больш і больш вопыту, тэатр пад кіраўніцтвам Рафальскага высоўваецца ў першыя рады лепшых нацыянальных тэатраў у Савецкім Саюзе.

М. Ф. Рафальскі моцна звязваецца з яўрэйскімі сучаснымі пісьменнікамі, і па яго ініцыятыве і пры яго непасрэднай дапамозе ўпершыню ў гісторыі яўрэйскай савецкай драматургіі з'яўляюцца п'есы «Ботвін» А. Вевюркі, «Лекарт» А. Кушнерова і інш.

Разгіраючы за творчым развіццём Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР, мы бачым шлях развіцця, як росквіту М. Ф. Рафальскага, як мастака. Яго вобразы рэалістычны, яго пастаноўкі социяльна насычаныя. У яго спектаклях, часам не пазбаўленых некаторых нацыяналістычных адхіленняў, ім створаны такія вобразы, як Лекарт, Ботвін, фон Валь, Гаучі, Вік, Аўрэмеле-гарбун, Цале, Рохале, і палы гад іншых вобразаў, якія ўвойдуць у гісторыю тэатра, як лепшыя ўзоры тэатральнага майстэрства. Рафальскі, у апошніх работах, асабліва ў спектаклі «Рэкрут» майстэрскі паказаў, як трэба вырашыць пытанне нацыянальнай формы і социялістычнага зместу. Не самалюбаўнае формай, а чоткая накіраванасць на лепшага выяўлення ўнутранага зместу, сэнсу сцэны, вобраза, дзеі. Скупыя прыёмы, суровая прастата, унутраная дынаміка, чоткія рухі, напружанасць—вось якімі сродкамі Міхаіл Фадзееві ч дабіваецца спектакля высокага мастацкага майстэрства.

І калі паглядзець на слаўны шлях, пройдзены Міхаілам Фадзееві чам за 25 год яго творчай дзейнасці, трэба сказаць: што з пасля окцябрскага перыяда пачынаецца поўны росквіт яго таленту, яго творчых магчымасцей, якія душыла чорная рэакцыя былой царскай Расіі. Толькі ва ўмовах совецкай улады пад кіраўніцтвам партыі Леніна-Сталіна культура і мастацтва ўсіх народаў СССР атрымалі поўны росквіт. У гэтых умовах выраслі талавітыя кадры нашай роднай совецкай інтэлігенцыі, якія беззаветна аддаць справе Леніна-Сталіна, нашай социялістычнай радзіме адным з добрых сыноў якой з'яўляецца наш юбіляр.

М. МОІН.

Тав. Рафальскі.

КАШТОЎНЫ ЎКЛАД У БАРАЦЬБЕ ЗА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ РЭВОЛЮЦЫЙНЫ ТЭАТР

Сакратарыят Міжнароднага аб'яднання рэволюцыйнага тэатра шле гарачае прывітанне і лепшыя віншаванні заслужанаму артысту рэспублікі і члену прэзідыума МОРТ М. Ф. Рафальскаму з 25 гадоваму юбілею яго сцэнічнай дзейнасці.

Дарагі таварыш Рафальскі! Ваша настойная і рэзнабаковая работа над стварэннем яўрэйскага тэатра ў БССР з'яўляецца каштоўным укладам у барацьбу за інтэрнацыянальны рэволюцыйны тэатр, якую ўзначальвае МОРТ. Вопыт вашай плодатворнай сцэнічнай дзейнасці, вашай барацьбы за стварэнне новага яўрэйскага рэпертуара, нацыянальнага па форме і социялістычнага па зместу, за выхаванне новых акторскіх кадраў, прынясе велізарную карысць работнікам рэволюцыйнага тэатру ў капіталістычных краінах.

Сакратарыят МОРТа жадае вам далейшай плённай работы на ніве совецкага тэатра і выказвае ўпэўненасць, што вы, з уласцівай вам энергіяй і настойлівасцю, будзеце і ў далейшым прадаўжаць у якасці майстра совецкага мастацтва і члена прэзідыума МОРТ сваю работу за новы социялістычны тэатр — тэатр рэволюцыйнага пролетарыята.

Старшыня Міжнароднага аб'яднання рэволюцыйнага тэатра ЭРВІН ПІСКАТАР.

Сакратар Міжнароднага аб'яднання рэволюцыйнага тэатра ГЕНРЫХ ДЫЯМЕНТ.

М. Ф. РАФАЛЬСКАМУ

Наркомасветы БССР шле вам гарачае прывітанне ва ўрачысты дзень дваццацапяцігоддзя вашай сцэнічнай дзейнасці. Наркомасветы цэніць праробленую вамі работу па будаўніцтву социялістычнай культуры і тэатральнага мастацтва, як яе часткі.

НКА упэўнен, што пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі вы ў далейшым усе свае творчыя сілы прысвяціце барацьбе за інтэрнацыянальны змест тэатральнага мастацтва, за высокамастацкае, зразумелае для мас, адлюстраванне на тэатры социялістычнай будоўлі нашай вялікай радзімы.

Нарком асветы БССР ЧАРНУШЭВІЧ.

ПРЫВІТАННІ тав. РАФАЛЬСКАМУ

У адрас юбілейнага камітэта прыбылі прывітанні ад інстытута Яўрэйскай пролетарскай культуры Украінскай акадэміі навук, ад Маскоўскага тэатральнага інстытута — дырэктара тав. Фурмалавай, Дзяржаўнага тэатра Узбекістана, Маскоўскага тэатра сатыры, тав. Нодэля, ад рэдакцыі «Палескай праўды», ад драматурга Файко і інш.

Дошка гонару

За дастрыжнае выкананне промфінплана 1934 года, узорную пастаноўку вытворчасці і ўпаладанне тэхнікай «Звязда» заносіць на дошку гонару:

На прадстаўленню Віцебскага гаркома КП(б)Б дадаткова заносім на дошку гонару наступныя прадпрыемствы:

29. ЗАВОД «ЧЫРВОНЫ МЕТАЛІСТ».
Дырэктар завода тав. СЛІОЗБЕРГ, сакратар парткома тав. СІМУНІН, старшыня заўкома тав. РАЧЫНСКІ.
Завод выканаў гадавы промфінплан 6 снежня на 100,13 проц.

30. ЛЕСАЗАВОД ІМЯ «ПРАВДЫ».
Дырэктар завода тав. ВАДАНОСАЎ, сакратар парткома т. СКУЛОВІЧ, старшыня заўкома т. ГУТКІН.
Завод выканаў гадавы промфінплан 6 снежня на 100,13 проц.

31. ВАТНАЯ ФАБРЫКА.
Дырэктар фабрыкі т. СЕЛІВАНАЎ, сакратар парткома т. БАРАНАЎ, старшыня заўкома тав. ЛАЗАРАВА.
Фабрыка выканала гадавы промфінплан 22 лістапада на 100,2 проц.

32. ФАБРЫКА «КІМ».
Дырэктар тав. МАРУШКІН, сакратар парткома тав. ЛЕУТАЎ, старшыня фабкома тав. БАРЫНВА.
Фабрыка выканала гадавы промфінплан 14 снежня на 100,3 проц.

33. ЛЮСТЭРКАВАЯ ФАБРЫКА.
Дырэктар фабрыкі тав. СЯМЕНАЎ, сакратар парткома тав. КАВІЦКАЯ, старшыня фабкома тав. АСТРАХАНЬ.
Фабрыка выканала гадавы промфінплан 1 СНЕЖНЯ НА 102.17 проц.

34. ФАБРЫКА ІМЯ КЛАРЫ ЦЭТКІН.
Дырэктар фабрыкі тав. ГАРАВЫ, сакратар парткома тав. ПАРХІМОВІЧ, старшыня фабкома тав. ЖУТЧАНКА.
Фабрыка выканала гадавы промфінплан 20 снежня на 100 проц.

35. ЦАГЕЛЬНЫ ЗАВОД № 2.
Трыкутнік: тт. КАЛНІЦКІ, Рабіновіч і Крывашэеў.

36. ЦАГЕЛЬНЫ ЗАВОД № 5.
Трыкутнік: тт. КАЛНІЦКІ, РАБІНОВІЧ і КРЫВАШЭЕЎ.

37. ЦАГЕЛЬНЫ ЗАВОД № 13.
Трыкутнік: тт. ЛЕОНАЎ, ВАЛЧОК, МАТУСАЎ.

38. ТОРФЗАВОД «ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНІК».
Трыкутнік: тт. БАРАВЫ, КУХАРЭЎСКІ, КАПУСЦІН.

39. АРЦЕЛІ «ЧЫРВОНЫ ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК». Старшыня праўлення т. ЛІЎШЫЦ; «Картанаж», старшыня праўлення т. БАЛХАН).
На прадстаўленню Бабруйскага РК КП(б)Б дадаткова заносім на дошку гонару наступныя прадпрыемствы.

40. МЯСАКАМБІНАТ.
Дырэктар тав. ГЕЛЬФАНД, сакратар парткома ЛАМАНОСАЎ.
Камбінат выканаў план на 126 проц.

41. ФАБРЫКА «ЧЫРВОНЫ ХАРЧАВІК».
Дырэктар тав. ХАЗАН, сакратар парткома т. ФАЙНБЕРГ, старшыня фабкома тав. МАРГОЛІНА.
Фабрыка выканала гадавы план на 1 снежня на 102 проц.

42. ШПАЛАРЭЗАЧНЫ ЗАВОД.
Дырэктар тав. КАГАН, сакратар парткома тав. КУДЗЯЛЬ, старшыня заўкома тав. КАЯЛАЎ.
Завод выканаў гадавы план 1 снежня на 101,9 проц.
Прамарцелі: «ШВЭЙПРОМ» (старшыня праўлення тав. ЧЭРНІН), «СІЛА ПРАЦЫ» (старшыня праўлення тав. КАРАЕЎ), ІМЯ КРУПСКАЙ (старшыня праўлення тав. ТРУБКІН), «СМОЛАСКІП» (старшыня праўлення тав. СЯРЭБРАНІКАЎ), «ЧЫРВОНЫ ТЭКСТЫЛЬШЧЫК», (старшыня праўлення т. ІТКІН), «ЧЫРВОНЫ МЭБЕЛЬШЧЫК», (старшыня праўлення тав. ДЫМКІН), «ОБАД» (старшыня праўлення тав. СЕГАЛЬ, вяровачная (старшыня праўлення тав. РЫЎІН), «ЗЕРНАЛЕС» (старшыня праўлення тав. КАЦНЕЛЬСОН), ІМЯ ГІКАЛО (старшыня праўлення тав. КРЫСКОВЕЦ).
Арцелі: «ДНЯПРО» (старшыня праўлення тав. БУЯНІЦКІ), «ТРУДМЭБЛЯ» (старшыня тав. ЭЛЬКІНД). Трыкатажная (старшыня тав. ЛЕНДОРВЕ), «1 МАЯ» (старшыня тав. ПЛОТКІН), тарфарэзная ТАРЧЫЛАВА (старшыня тав. ЛАСКІН).

43. Менскі завод імя КІРАВА (дырэктар завода тав. ДРАБЫШЭЎСКІ, сакратар парткома тав. ГУРАЛІС, старшыня заўкома тав. ГАЛЬПЕРЫН). Завод выканаў гадавы план 18 снежня на 101 проц.

44. МЕНСКІ ЗАВОД «БОЛЬШЭВІК».
Дырэктар тав. БАНДАРЧЫК сакратар парткома тав. ПЕРАЧЫНСКІ, старшыня заўкома тав. ФЛЮКСМАН.
Завод выканаў гадавы план 17 снежня на 102 проц.

45. МЕНСКАЯ ФАБРЫКА «КОМУНАРКА».
Дырэктар фабрыкі тав. ЛЮБІН, сакратар парткома тав. КОПЕЛЕВА, старшыня фабкома тав. БРУДНЕР.
Фабрыка выканала гадавы план 11 СНЕЖНЯ.

46. ФАБРЫКА ІМЯ 8 САКАВІКА
Дырэктар фабрыкі тав. ШАПІРА, сакратар парткома тав. СУХАЛІЦКІ, старшыня фабкома тав. ДРЭЙДЗІН.
Фабрыка выканала гадавы план 23 снежня на 100,1 проц.

47. ФАБРЫКА «ОКЦЯБР».
Дырэктар тав. ДРАГІЛЕЎ, старшыня парткома тав. КАПОПІН, старшыня фабкома тав. ГАЛАВАЧ.
Гадавы план фабрыка выканала 12 снежня на 100,1 проц.

48. МЕНСКАЯ ФАБРЫКА ІМЯ ВАРОЎСКАГА.
Дырэктар фабрыкі тав. РАГОЎСКІ, сакратар парткома тав. Быкаў, старшыня фабкома тав. Дуберштэйн.
Гадавы промфінплан фабрыка выканала 23 СНЕЖНЯ.

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

САКРАТАРУ БАБРУЙСКАГА РК КП(б)Б тав. МІЛЛЕРУ

ПАДРЫВАЮЦЬ ІНІЦЫЯТЫВУ РАБОЧАГА КАНТРОЛЮ

Рабочы кантроль па Бабруйскаму лесахамбінату з пачатку арганізацыі старанна ўзяўся за работу. Кантроль выкрыў рад злачынстваў у ЗРК, прыгараднай гаспадарцы і ў сталовай.

Рабочых прыгараднай гаспадаркі сістэматычна абважвалі пры выдачы хлеба. У крамах ЗРК прадавалі капусту па 50 кап. за кілограм замест 35 кап. Сталовыя № 1 і № 2 не даважвалі пры выдачы хлеб і прадукты. Замест патрэбных рабочаму на абед 150 грам выдавалі 100-125 грам. Яблыкі другога гатунку прадавалі па 85-90 кап.,—па цане першага гатунку.

Аб усім гэтым паведамілі райкому, але ён не рэагаваў на матэрыялы кантролю. Такія адносіны падрываюць ініцыятыву і аўтарытэт рабочага кантролю.

Нарэшце трэба канчаць пытаннем аб ігнараванні рабочага кантролю па лесахамбінату.

ПЛЕВАКА РЫГОР.

САКРАТАРУ ЧАВУСКАГА РК КП(б)Б тав. КУЛІКАВУ

РАЙЗА ЗРЫВАЕ МЕЛІЯРАЦЫЙНЫЯ РАБОТЫ

(ПІСЬМО МЕЛІЯРАТАРА)

У 265 калгасах Чавускага раёна трэба правесці меліярацыйныя работы. На гэта РВК асігнаваў 500 руб.

Аднак, загатчык раёна тав. Сватноўскі не аддае ўвагі гэтаму важнаму пытанню. Не дапамагае і мае шматлікія просьбы, каб райсаўказанне калгасам аб выкананні рабочай сілы для работы па меліярацыі. Райсаў не адпускае нават грошай, асігнаваных на каштарысу РВК.

У выніку не выконваецца план меліярацыі ў раёне.

ЗАКАБТОВСКІ.

САКРАТАРУ ТАЛАЧЫНСКАГА РК КП(б)Б т. ТУРКУ

ВЫГНАЦЬ КУЛАКА З КАЛГАСА

(ПІСЬМО СЕЛЬКОРА)

У калгасе «Новае жыццё», Шманаўскага сельсовета, Талачынскага раёна, працаўдзе кулак Крыніцкі Сямён. Будучы начальнікам гаспадаркі, ён згнаіў 1.000 пудоў бульбы і сістэматычна разкрадваў калгасны хлеб.

Неаднакрэ раз аб гэтым калгаснікі пісалі ў райвыканкам, але ўсе іх скаргі там кваліся ад суседа. Больш таго, Крыніцкага выбралі прыначыцем брыгадзіра другой брыгады.

ДАНАРАЦКІ.

У дапамогу прапагандысту

МАЛАДЫЯ ПАРАСТКІ АНТЫСОВЕЦКАЙ ГРУПЫ

Нешчы раз, калі супроць партыі выступала тая ці іншая апазіцыя, яна заўсёды прабавала процідзеяць комсамол партыі, скарыстаць моладзь у сваіх антыпартыйных мэтах. Так было з трацкісцкай апазіцыяй, з зіноўеўскай апазіцыяй і з правымі апартуністамі.

Многія з маладых рабочых і калгаснікаў, многія з комсамольцаў не памятаюць, з якой жорсткасцю раз гарнулася барацьба за моладзь у дні ўзнікнення зіноўеўскай апазіцыі.

Дыскусія, якая вялася ў той час у партыі, хвалявала і не магла не хваляваць комсамол, бо закраналіся карэнныя праблемы выхавання моладзі. Аб будаўніцтве социялізма ў нашай краіне, аб характары нашай прамысловасці, аб лініі партыі ў вёсцы, аб ацэнцы сутнасці нэпа—усе гэтыя пытанні карэнным чынам цікавілі моладзь, якая павінна была ведаць, правільна ацэньваць абстаноўку, у якой жыве, і бачыць перспектывы нашага развіцця.

Ядам бязвер'я ў наша будучае, у пераможнае будаўніцтва социялізма прабавала атруціць комсамол зіноўеўская апазіцыя. І горшых прадстаўнікоў комсамола, — якія пазней скаціліся ўсё ніжэй і ніжэй і сталі падонкамі,—яна зрабіла рупарам варожых класавых элементаў. Рудзянцаў, Каталынаў, Шатскі і другія, натхняемыя і заахвочваемыя вярхамі зіноўеўшчыны, не ганьбуючы ніякімі сродкамі, прабавалі процідзеяць сябе Ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту партыі, усяму паўтаранільнаму комсамолу. З ведамы тагочаснага апазіцыйнага ленінградскага губернскага камітэта партыі — Зіноўева, Еўдакімава, Запуцкага і другіх—яны прабавалі ператварыць ленінградскую канферэнцыю ва ўсерасійскі з'езд комсамола.

Ім патрэбна была ўсерасійская трыбуна, каб павесці шалёную атаку на партыю, на Цэнтральны Камітэт комсамола. Чаго яны хацелі, да чаго яны клікалі моладзь?

Комсамольская апазіцыя падхапіла і цалкам падтрымала зіноўеўскі тэзіс — НЯВЕР'Е Ў ПЕРАМОГУ СОЦЫЯЛІЗМА Ў НАШАЙ КРАІНЕ. Тады-ж, у 1926 годзе, тав. Сталін, характарызуючы сутнасць памылак зіноўеўскай апазіцыі, гаварыў: «Я думаю, што нявер'е ў перамогу социялістычнага будаўніцтва з'яўляецца асноўнай памылкай новай апазіцыі. Памылка гэта з'яўляецца, па-мойму, асноўнай таму, што з яе выцякаюць усе астатнія памылкі новай апазіцыі... па пытанню аб нэпе, аб дзяржкапіталізме, аб прыродзе нашай социялістычнай прамысловасці, аб ролі казенацыі пры дыктатуры пролетарыяту, аб метадах барацьбы з кулацтвам, аб ролі і ўдзельнай вазе сярэдняга сялянства».

Нявер'е ў перамогу социялізма ў нашай краіне жывіла і комсамольскую апазіцыю. Не веручы ў сілу рабочага класа і яго здольнасць уцягнуць мільённыя масы сялянства ў социялістычнае будаўніцтва, спалохаўшыся труднасцей, пасуючы перад імі, яны кідаліся з боку ў бок. То яны прапаноўвалі ўцягваць у комсамол на працягу года два мільёны сялянскай моладзі, то яны, спалохаўшыся «мужыцкай стыхіі», шараханіся ў другі бок і прапаноўвалі будаваць плацціны—зусім не прымаць у комсамол серадняцкую моладзь. Для гэтай моладзі яны прапаноўвалі арганізаваць дэлегацкія сходы беспартыйнай серадняцкай моладзі з пастаянным складам.

Што гэта азначала? Апазіцыя імкнулася аддзяліць ад комсамола серадняцкую моладзь, прабавала адмахнуцца ад яе перагавання і ўцягнення ў социялістычнае будаўніцтва.

«...Несумненна, — пісаў тав. Сталін напярэдадні 14-га з'езда партыі ў артыкуле «Аб задачах комсамола», — што асобыя дэлегацкія сходы серадняцкай моладзі пры комсамоле немінуча ператворацца пры сучасных умовах ежыўлення ўсіх груп сялянства ў асобы саюз серадняцкай моладзі. Пры гэтым гэты асобы саюз у сілу неабходнасці будзе вымушан процідзеяць сябе існуючаму саюзу моладзі і яго кіраўніцтву—РКП, будзе адцягваць да сябе сялянскую частку комсамола і створыць, такім чынам, небяспеку распаду комсамола на два саюзы—на саюз рабочай моладзі і саюз сялянскай моладзі».

Прадстаўнікі ленінградскай комсамольскай апазіцыі, гэтыя маладыя «ліквідатары» з мандэтам ад Устрапава, крычэлі аб перараджэнні комсамола, аб захпёстванні яго дробна-буржуазнай стыхіяй. Сваё перараджэнне, якое намецілася ўжо тады, гэтыя маладыя парасткі зіноўеўскай апазіцыі, якія замацніўшы ператвораць комсамол у перараз да заядлых бандытаў, фашысцкіх галаварэзаў, выдавалі за перараджэнне усяго саюза.

Апазіцыя гаварыла аб комсамоле як аб немачнай, хворай, развальваючайся арганізацыі, яна прабавала напужаць партыю, прарочыла, што далей будзе яшчэ горш: «Інакш кажучы, мы хочам перасцерагчы, каб комсамол не ператварыўся ў рахіцічна».

Жыццё, наша яркая социялістычная сапраўднасць перавярнула ўсе разлікі і прагнозы апазіцыі, ворагаў партыі і рабочага класа. У яркім святле двух пяцігодак, у святле самаадданай барацьбы працоўнай моладзі на рыштаваннях Сталінградскага трактарнага, на домнах «Магніткі» і Кузнецка, на пл ціне Дняпра, на палях калгасаў і совгасаў,—якім подлым і жалкім выглядзіць паклёп апазіцыі на комсамол, на социялістычную радзіму!

Бітыя на XIV з'ездзе дробна-буржуазныя капітулянты на супакойваліся. Прызнаўшы на словах лінію партыі, яны другімі метадамі прадаўжалі сваю антыпартыйную падрыўную работу. Раней, калі ім трэба было выступаць супроць ЦК партыі, яны крычалі, што комсамол не можа быць нейтральным, і аб'ядноўвалі вакол сябе ўсіх незадаволеных пролетарскай дыктатурай, усе анархісцтвуючыя, поўзапажыўшыяся элементы. Але, пацярпеўшы паражэнне на XIV з'ездзе партыі і ў радах ленінскага комсамола, аказаўшыся ізаляванай кучкай, яны прабавалі давіць на рабочую моладзь. У Ленінградзе яны забаранялі рабочай моладзі абмяркоўваць і вывучаць рашэнні XIV партыйнага з'езда, яны запалохвалі моладзь, забаранялі комсамольцам распаўсюджваць партыйную літаратуру.

Але не ўдалося ім абапрацца на гэтым. Ленінградская моладзь хутка прагнала сутнасць антыпартыйных, антыпролетарскіх важакоў і заразжа ўбрала іх ад кіраўніцтва. Пасля гэтага, разбітыя канчаткова, яны фармальна падначаліліся партыйнай дысцыпліне, а па сутнасці прадаўжалі свае антыпартыйныя дзеянні, сваю падрыўную работу. Змоўнікам на час, перамога будзе за намі, — такі быў іх дэвіз.

І тады гэтыя подлыя маладыя парасткі зіноўеўшчыны Румянцаў, Каталынаў, Шатскі і іншыя—сталі на шлях двурушніцтва, ашуканства партыі, на шлях здрадніцкай, шпіёнскай работы. Усе гэтыя гады, аж да першаснежаньскага стрэлу ў Сергея Міронавіча Кірава, гэта банда гнілых перараджэнцаў, марыўшая аб інтэрвенцыі, маральна і палітычна апускаючыся ўсё ніжэй і ніжэй, паступова рыхтавалася да подлых забойстваў з-за вугла правадыроў партыі і совецкай улады.

Двурушнічаючы, усімі сіламі дабіваючыся захавання ў партыі, яны пад сцягам тэарэтычнай работы екапаліся ў арганізаваным імі зямляцтве «старых комсамольцаў» пры ленінградскім гістамоле.

Нікчэмныя гнусныя ахвосці, усё больш і больш маральна разпагаючыся, трацячы пад ногамі глебу, нінуліся к апошняму брудному сродку ўсіх падонкаў капіталізма —К ТЭРАРЫЗМУ. Яны радаліся тым, хто лютай нянавісцю ненавідзіць нашу социялістычную радзіму. Яны сталі прадажнымі лакеямі памірашчага капіталістычнага ладу.

З асяроддзя гэтай антыпартыйнай групы вышаў подлы забойца Нікалаеў. Доўга рыхтуючыся і цэпячыся, яна накіравала руку Нікалаева ў таго, хто ўсё сваё жыццё вёў бясстрашную і рашучую барацьбу з ус

25 СНЕЖНЯ—МЕНСКІ РАЁННЫ З'ЕЗД СОВЕТАЎ

Расказ пра сілу, што перабудоувае свет

I. Крок эпохі

Я добра помню вясну 1930 года.

Я помню, як займалася гета цудоўнае неверагоднае жыццё, як бурна рушыла яно праз неасяжныя палі калгайкраіны, зносячы межы, адкрываючы прасторы.

Я помню: вясна ў той год была ранняя, дружная. Угретая сонцам зямля прагна, настойна чакала свайго апладнення.

Смелыя дружна браліся за работу, з убогіх акраўкаў снае спраўжнае мехдзы, з дзелых шаўлюжак, з драных хамутоў, з выраўнанае збруі складалі арсенал для сваёй барацьбы для першага свайго бою за сацыялізм.

Я помню: першы калектыўны выезд у поле быў гады сімвалам першага магутнага ўдару, першай перамогі над старым светам.

... І вось нядаўна мне давялося наведаць тыя мясціны, дзе сустракаў я колісь базную вясну 1930 года.

Мы пад'язджалі туды ясным восеньскім надвячоркам, цудоўным надвячоркам цёплага бабінага лета.

Нас сустрэлі новыя, але ўжо абжылыя, ужо характэрныя для ўсяе нашае вёскі, рукі: лапатаў трактар, працавіта гудзела малатарня, пырскалі асколкі свежага смеху, вясёлых выкрыкаў моладзі.

Старая знаёмая вёска раптам адкрылася зусім непазнаванай перспектывай:

На шырокай роўнядзі выстраіліся жалезныя гаспадарчыя будынкі калгаса — шчытныя, кранкія, як усё гета маладое задорнае жыццё. Канюшні, кароўнікі, свінушнікі... Зводдаль прагавіта разазвяла сваю чорную пашчу гумно. Побач з ім, здаецца, пад самае неба, узнімаецца гара толькі што абмалочанай, яшчэ не прыбранай саломы. Яшчэ далей палягілі доўгімі гладкімі тушамі незлічоныя капцы калгаснае бульбы.

Мы едзем пад гумно, туды, адкуль ляцець да нас гукі жвавай працы.

Вялізная цяжкая махіна — складаная малатарня — з сярдзітым буркатнем убірае ў сябе цэлыя груды збожжа — яно праходзіць праз усю яе таемна-блытаную сістэму і вылятае ў адзін бок ахапкамі мятай пылкай саломы, а ў другі выліваецца роўным цурочкам чыстых зярнят.

Каля машыны, каля саломы, каля чудотных мяшкоў гатовага збожжа навіваецца гурма калгаснікаў, амаль што выключна моладзі. Вясёлыя расчырванелыя ад працы дзяўчаты сустракаюць нас смелымі ўсмешкамі, першыя заводзяць з намі жартаўлівую гутарку. З гумна вылятае раптам дражліва звонкая прыпеўка і, ураз сарваўшыся, пераскінуўшыся ў гуллівы рогат, узмывае цэлую хвалю агульнай вясёласці. І здаецца, што разам з усімі добрадушным салідным смяшком смяецца неўгамонны «фордзон».

Мы сустракаемся з старшынёй калгаса і разам з ім аглядаем калгасную гаспадарку. Чорнавусы будзёнавец Васіль Бортнік—энергічны вясёлы брыгадзір — паказвае нам падначаленую яму калюшню. Наша шчырае захапленне ёю прымае без асаблівае ўвагі — ён прывык ужо да гетага захаплення. Ён бачыў яго ў кожнага, хто пераступаў парог каюшні. Ён бачыў нават яго ў вострых пранізлівых вачах свайго былога камандзіра тав. Будзённага, калі той, аглядаючы жывёлагадоўчук высцяўку, праходзіў паўз шарэнгу стройна, па-ваеннаму выстраеных коней калгаса «Новы быт».

Правадыр чырвонай конніцы пазнаў свайго былога ваяку, прывітаўся з ім і ў простай сяброўскай гутарцы выказаў яму сваё здавальненне калгаснымі коньмі. За ўзорную пастаноўку конкай гаспадаркі тав. Будзённы ў падарунак калгасу прыслаў потым з Масквы добрага заводнага жарабка «Барбарысюка».

Пасля мы аглядалі кароўнік, свінушнікі, свірны — усюды было ўсё вялікае, крэпкае, гаспадарскае, усё паказвала бурны рост і ўмацаванне калгаса. Мы запыталі, нарэшце, аб тым, што з'яўляецца на сённяшні дзень асноўнай меркай новага калгаснага добрабыту, мы запыталі, толькі заработку прыпадае за гады год на працадзень калгасніка, і нам з гонарам адказалі:

— Чатыры кіло зернавых і пятнаццаць кіло бульбы. Апроч таго—гародніка, салома сена і т. д. Маем і сваю хатнюю гаспадарку. Ёсць такія, што маюць па трыццаць, па сорак гусей. Адным словам, жывем так, як раней не жылі...

Цяжка, амаль немагчыма было даць веры, што ўсё гета зроблена за 4 гады, што такі магутны, такі стагнацкі крок зрабіла за гэты кароткі час наша эпоха. І ва ўсёй сваёй тытанічнай велічы паўставала ва ўяўленні тая глыбока-дзейсная непераможная сіла, якую нясе ў сабе, адзіная партыя пролетарыята — арганізатар і кіраўнік цудоўнага ператварэння свету.

2. З чаго пачыналася справа

Была гутарка совецкіх пісьменнікаў з сакратаром Менскага гаркома КП(б)Б тав. Рыскіным. Тав. Рыскін надзвычай проста, надзвычай скромна тлумачыў нам, як Менскі раён дасягнуў таго, што зайсёк на ўсесаюзную чырвоную дошку.

— Было некалькі ўмоў вялікіх поспехаў. Першая і асноўная ўмова — гэта тое, што наша работа была часткай агульнай работы, якую вяла ўся партыя, — работа па здзяйсненню вялікага сталінскага лозунга — зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

— Другая ўмова — штодзённая дапамога з боку Цэнтральнага Камітэта і, асабліва, з боку тав. Гікало, гетага выключнага кіраўніка і арганізатара.

— Трэцяя ўмова — дапамога горада, гаралскіх арганізацый, гарадскога пролетарыята.

І, нарэшце, чацвертая ўмова — добра падабраны актыў як раённы, так і вёзавы, які без крыкаў, без палітыканства, не за страх, а за совесць працаваў над праведзеннем лініі партыі.

Калі тав. Рыскіну напамінаюць яшчэ пра адну ўмову выдатных поспехаў раёна, пра якую яму не дазволіла гаварыць яго большэвіцкая скромнасць, тав. Рыскін непярпліва моршчыцца і амаль сардзіта адказвае:

— Гета глупства, што работу звязваюць з адным чалавекам. Адзін чалавек нічога не зробіць, толькі дружным калектывам можна дасягнуць сапраўдных поспехаў... Вось намеснік мой тав. Хадасевіч адорава працаваў... Турэцкі, які ведае раён, што сваю хату, тав. Жарын, тав. Варончанка і інш.

Тав. Рыскін кідае на тав. Варончанка вясёлы погляд і, канчаткова адхіліўшы ад сябе назойлівую тэму, пачынае расказваць нам гісторыю слаўнае перамогі Менскага раёна на калгасных палях.

Што характэрна было ў гетай гісторыі?

Тут была большэвіцкая ўпартасць, тут былі тэмпы, тут была аператыўнасць. І была тут яшчэ адна рыса, якая надзвычай ярка характарызуе ўвесь стыль партыйнага кіраўніцтва. Яна заключаецца ў тым, што для большэвікоў няма падзелу пытанняў на важныя і няважныя, на высокія і нізкія, на чыстыя і брудныя. У самым дробным знаходзіцца частка вялікага і самае бруднае носіць у сябе адбітак высокага, чыстага...

— Справа пачыналася, — расказвае тав. Рыскін, — з вельмі прозаічных матэрый: з гною і торфу. Мы разумелі, што добрая папярэдняя падрыхтоўка забяспечыць нам своечасовае разгортванне веснавых работ. Мы арганізавалі зімовую вывазку гною і торфу па поле і не толькі вывазвалі, я і перавазвалі план у два разы. Потым — з канём. Мы рашылі правесьць усё наша конскае паголоўе. Мабілізавалі для гетага ўвесь актыў і паслалі аглядаць коней. Мы зрабілі так, што ні адзін конь не мінуў гетага агляду. Таксама і з інвентаром. Затое мы дабіліся таго, што к пачатку вясны добра ведалі, з якімі сіламі мы выходзім на поле.

Факты і лічбы, якія прыводзіць нам тав. Рыскін, ярка паказваюць усе далейшыя поспехі менскіх большэвікоў. Сяўба, уборка, хлебазагатоўкі, лён, мяса — не было ні адной кампаніі, у якой-бы Менскі раён не заняў першае, або хоць адно з першых месц. Ва ўсім гетым ярка адчуваецца велізарная работа, якую правяла партыйная арганізацыя па арганізацыі і выхаванню мас. Знайсці падабраць людзей, падрыхтаваць іх, выхаваць, падняць на ўзровень поўнага ўсведамлення задач соцыялістычнага будаўніцтва—гета асноўнае з таго, што неабходна каб перамагчы.

— Нам удалося стварыць добры надзейны актыў — як партыйны так і беспартыйны. Старшыня калгаса, брыгадзір — гета асноўнае звяно. Часам бывае цяжка адрозніць партыйнага брыгадзіра аб беспартыйнага. Мы з беспартыйным гаворым партыйнай мовай, і ён яе разумее... Мы навучыліся працаваць з людзьмі. Не адміністраваць, не камандаваць, а выхоўваць...

І тав. Рыскін, як характарыстыку праўдзівага большэвіцкага падыходу да людзей, прыводзіць надзвычай паказальны факт: за ўвесь перыяд летніх работ не было ніводнага выпадку адлучы пад суд і не было ніводнага выпадку выключэння з партыі.

Аднак, сіла большэвікоў не толькі ў тым, што яны ўмеюць дасягнуць поспехаў. Сіла большэвікоў і ў тым, што гетыя поспехі ні на хвіліну не даюць ім заспакаення, не туманяць галовы пачуццём гонару. І таму нічога не было паказнога, надуманага ў тым, калі тав. Рыскін, канчаючы гутарку, проста і ўпэўнена заявіў:

Злева направа: сакратар менскага гаркома КП(б)Б тав. РЫСКІН, старшыня аргбюро РВК тав. ЖАРЫН, часова выконваўшы абавязкі старшыні аргбюро РВК тав. ТУРЭЦКІ.

— Нельга сказаць, каб мы працавалі так, што дзней і не трэба. Можна было працаваць куды лепш і куды больш можна было зрабіць. Мы не думаем спыняцца на тым, што дасягнулі, мы будзем ісці наперад і, наперадзе, я ўпэўнен, нас чакаюць большыя поспехі, чымся тыя, аб якіх гаварыў я сёння.

3. Жыццё на колах

Штодня гадзіне а трэцяй-чацвертай па адной з чыстых шырокіх дарог, што злучаюць сталіцу з перыферыяй, выбягаў жвавы, хоць і досыць патропаны ад доўгай язды па прасёлках, форд. У фордзе выязджалі адказныя работнікі гаркома і горсовета на раён праводзіць ў жыццё лінію партыі.

Машына спынялася ля аднаго з намечаных калгасаў, работнікі вылазілі, ішлі да дому, у якім змяшчаец ца праўленне, але яшчэ па дарозе сустракалі заклапочанага старшыню калгаса, і, на ходу папытаўшыся пра дароўе жонкі, дзяцей, пераходзілі да справы:

— На паўсотні процантаў застыў га? У чым справа? Чыя брыгада адстае? Васілёва? Што з ім такое?

І з першага дзесятка слоў, уключыўшыся ў жыццё і клопаты калгаса, пачынелі дзейнічаць. Садзілі з сабой на форд старшыню і ехалі ў брыгаду. Брыгадзір, адно пачуўшы знаёмае порокане машыны, дагадваўся ў чым справа і сустракаў начальства з сарамліва адведзенымі ў бок вачыма з рукамі, нарыхтаванымі да разгублена-бязвінага геста.

Ішлі на поле, гаварылі з калгаснікамі, жартавалі, падбадзёрвалі і разам з тым на самым нізе, на самай вытворчасці вывучалі прычыны прарыву. Збіралі актыў, гаварылі «па душах», раіліся, абмяркоўвалі і дамагаліся таго, каб тон пасўнага адновання, самавытвараўдзявання змяніўся на тон дзелавога дружнага шукання выхаду.

Гета ўжо была перамога.

І, пакінуўшы пасля сябе бадзёры працавітых настрой, пачуццё калектыўнай адказнасці за далейшыя поспехі і нядаўчы, садзіліся на машыну і зноў куляліся па прасёлках, пад'язджаючы да суседняга саўгаса, да наступнага пункту свае работы.

У соўгасе ішлі адразу ў вялікія прамысловага тыпу свінушнікі і стара рашча абшэрныя ногі крэаліям, углыбляліся ў нетры свінчога царства. Работніцы, што даглядаюць сяўней, сустракалі іх ветлымі ўсмешкамі і, як людзям паважным, добра асвядомленым у справе, шчыра расказвалі ўсе свае апошнія навіны.

— «Матруна» апарасілася, аж дзесяцера парасят. А «Бочка» — зірніце во, нахудзела нешта. Нямаю ляч што за ліха... Дача добрая і есць, здаецца, нішто... І каб сказаць на гульню паказвала, дык таксама не... Заўтра фельчар будзе, хай паглядзіць...

Раённыя кіраўнікі перахіляліся цераз загародкі, увважна разглядалі тлустыя бакі завадскіх кормнікаў, а замілаванай усмешкай любаваліся плоймай прозрыста-белых жвавых парасят і, распытваючы работніц, не шчкваючы, меркавалі аб тым, чаму соўгас не выконвае паложанай нормы мясапаставак. І калі, сустрэўшыся з дырэктарам, пачыналі з ім гутарку на гетую тэму, той адно дзівіўся выключна дзелавітай канкрэтнасці іхніх прапаноў і парад.

І зноў форд, зноў вузенькія закручастыя прасёлкі.

Прыязджалі ў сельсовет, дзе ўжо чакалі іх, сабраўшыся на нараду, старшыні калгасаў — асноўнае звяно нізавога актыву на падбор, на выказванне яшчэ накладзена столькі сіл і энергіі. Гета ўсё — новыя людзі ў поўным сэнсе гетага слова, у якіх амаль не знойдзеш і рэштак вузка-дзяляцкай хутаранскай абмежаванасці, якія навучыліся ўсю сваю штодзённую гаспадарчую працу падпарадкаваць чарговым патрэбам і заданням соцыялістычнай дзяржавы.

Пасля невялічкага ўступнага слова пачыналіся выказванні, абмен думкамі, вопытам, пачыналася дружная сяброўская гутарка, у якой ужо рэдка-рэдка чуваць быці ноткі пустых нараканняў за цяжкасці, на непасільнасць работы, на празмернасць укладзеных партыяй і дзяржавай заданняў. Замест гетага ўсё мацней, усё выразней у дзелавіта-спрыманых словах актывістаў гучалі ноткі гордасці за спраўнае выкананне абавязкаў перад дзяржавай.

Але бывала і тая, што ў дружнай сям'і адкрывалася раптам недзе вострым сіверам пятыхаў класава-варожы вецер. І вось — канчалася нарада, скромныя, непрыметныя бязвальбіты за новае жыццё разыходзіліся па сваіх базавых пастах, а ў душным дашчэнту закураным пакоі яшчэ доўга пягнулася шчырая гутарка некалькіх чалавек. У гетай гутарцы дзіўна перапляталіся пытанні высокай палітыкі з дробязямі сямейнага бытавання, далёкія ўспаміны з планамі будучыні, жаскавыя словы з рэзкімі асуджэннямі. А на развітанне горача ціскалі адзін аднаму рукі і абяцалі ісці разам, плячо ў плячо па шляху далейшай працы і барацьбы.

І позна ўначы па адной з чыстых шырокіх дарог, што злучаюць сталіцу з перыферыяй, убягаў у горад жвавы, хоць і досыць патропаны ад доўгай язды па прасёлках форд. У фордзе вярталіся адказныя работнікі з раёна, дзе ў жывой канкрэтнай абстаноўцы праводзілі яны лінію партыі.

4. План брыгадзіра Валодзькі

Брыгадзіра Валодзьку я сустракаў два разы: першы раз на напыраным пасяджэнні прэзідыўма сельсовета і другі — на таварыскай сустрэчы совецкіх пісьменнікаў з знатнымі людзьмі калгасных палёў Менскага раёна. На пісьменніцкім вечары тав. Валодзька дужа цікава і горача гаварыў аб тым, як ён з сваёй брыгадай заказваў пераходны сцяг палітаддзела.

Але мне ўспамінаецца больш наша першая сустрэча з Міхасём Валодзькам. Позна ўвечары мы хадзілі з ім па бязлюднай вуліцы сённяшняга мястэчка і ён расказваў мне пра сябе, пра сваю брыгаду, пра тое, як партыя падняла яго і навучыла мы бокай мудрасці — на маленькім участку робіць вялікую ўсеабдымную справу.

Валодзька з выгляду зусім маладзы хлапец. Ён не страціў яшчэ здольнасці да юнацкага захаплення, і гетае захапленне раз пораз прарываецца скрозь яго вонкавую рэзанёрскую спакойнасць. Акруглыя плаўныя рэсты яго тады зрываюцца блытаюцца, ён раптам суніцаецца на поўкроку і блыка нахіліўшыся, пачынае гаварыць гарачым змоўніцкім шэптам:

— ...дык я абіў дошку, да яе колік прымацаваў і дзе працуе звяно, там жа, на месцы — ўторкнуў у зямлю і—нацо, чытайце... Перш і глядзець не хацелі, а потым бачу — адзін падыйшоў, пачытаў, другога паклікаў. Дзе хто падгуляў троху, злайдачыў — зараз артыкульчык і ёсць. Здорава памагала... Выпускалі штодня на працяту ўсіх гарачых летніх работ...

І, зноў перайшоўшы на розанёрскі разважны тон, Валодзька дзелавіта заключыў:

— Вялікая гэта справа... Дзесяць раз скажаш — хоць-бы што. А прапісаў у газеты—глядзіш, дадзела...

Валодзьку дасталася была адсталая, амаль безнадзейная брыгада. Поўнае гаспадарчае бяспадзіе, адсутнасць працоўнае дысцыпліны, пакражы... Пэлае гняздо класава-варожых учыняў. Валодзька і сам перш не верыў, каб выйшла што-небудзь людское.

— Хацеў зусім адмовіцца, не верыў у свае сілы. Але падтрымаў палітаддзел, партыйная арганізацыя дапамагла і, бачыце, сёе-тое выйшла.

А «сёе-тое» гета — дасягнала арганізаванная гаспадарка, гета стопроцантны ахоп калгасам бядняцкай і серадняцкай часткі насельніцтва, гета ўдарная конеферма, гета высокія нормы аплаты, якія цалкам забяспечваюць заможнае жыццё калгаснікам.

Я хачу некалькі слоў сказаць пра славуты шлях брыгадзіра Валодзькі.

Неяк раз сакратар гаркома тав. Рыскін у адзін з сваіх чарговых выездаў на раён наведаў шостую брыгаду калгаса «Ленінскі шлях», брыгаду т. Валодзькі. Гета было позна самым пачаткам жніва і, калі тав. Рыскін запытаў, за які час мяркуе брыгадзір зжаць усё сваё жыта, Валодзька цвёрда заявіў, што, калучы пры жняярцы, ён усе 68 га салме роўна за тры дні. І, каб пацвердзіць свае словы, паказаў загадка складзены, дакладна размеркаваны план гетай работы.

Тав. Рыскін праглядзеў план — у ім было ўсё прадуважана да найменшай драбніцы — і, убачыўшы калгасніцу, якая ў гэты час праходзіла міма іх, запытаў яе, што яна будзе рабіць, як пачнецца жніво. Калгасніца, не задумаўшыся, адказала, за якой машынай яна будзе ісці, якая ёй вызначана норма выпрацоўкі і т. д.

Валодзька здаволена ўсміхнуўся: гета выпадковая праверка паказала, што план не толькі напісан на паперы, а ўжо даведзен да кожнага калгасніка і калгасніцы.

Тав. Рыскін узяў з сабой копію плана і сказаў, што праз тры дні пасля пачатку жніва ён зноў прыедзе і праверыць, як будзе выканан план. Калі ён сапраўды прыехаў, на полі не стаяла ніводнага каласка жыта.

У леташнім годзе адна машына выжынала за дзень у сярэднім 3-4 гектары; сёлета на кожную машыну прыпала 7 гектараў. Такая рэзкая розніца тлумачыцца выключна правільнай арганізацыяй працы, цвёрдым выкананнем загадка распрацаванага плана.

Вось некаторыя цікавыя моманты з гетага плана.

Каб забяспечыць стопроцантны выхад на поле ўсіх працаздольных калгаснікаў і калгасніц, было ўтаноўлена дзяжурства на вёсцы старых дзядоў і бабуль, якія абходзілі па чарзе ўсе двары, сачылі за парадкам у хатах, даглядалі дзяцей, хатнюю жывёлу і т. д.

З мэтай дакладнага ўліку працоўнай сілы жанчыны-спонавязальшчыцы былі пазбаўлены свайго ўзросту і фізічнай сілы разбіты на тры катэгорыі. Першыя, самыя маладзейшыя і дужайшыя, ішлі за машынай 8 чалавек, другія, троху слабейшыя, за другой машынай ішлі 12 чалавек і, нарэшце, трэцяя машына мела за сабой звяно з 16 пажылых кабет, якія, безумоўна, маглі зрабіць толькі палавіну таго, што рабілі здаровыя, поўныя сіл, дзяўчаты і маладзіцы.

Была арганізавана правільная змена конскай сілы, што забяспечвала амаль бесперапынную работу машын.

З гетай-жа мэтай ішла безупынная точка нажоў, якія мяняліся таксама на ходу, не затрымліваючы работы.

Нават барацьба са стратамі была пароі прадугледжана — за кожнай машынай ішла брыгада добраахвотнікаў-пісцеваў, якія тут-жа падбіралі каласы.

План т. Валодькі можна разглядаць як ідэальны. Можна, відочная рэч, знаходзіць у ім і недахваты, можна, наадварот, западозрыць яго ў некаторым рэкардменстве—справа, безумоўна, не ў гетым. Валодзька — гета толькі адзін з многіх, адзін з дзесяткаў, тысяч, мільёнаў Валодзька — канкрэтны прыклад таго, як вялікі прынцып пластыі знаходзіць сваё адбітак у самым маленькім куточку жыцця, як адзін рух дасканалага механізма даходзіць жыватворчаю хваляй да кожнага нават самага далёкага, нават непрыметнага рычажка.

5. Машыны і людзі

Машына ў нашай сельскай гаспадарцы — гета не толькі энная колькасць конскіх сіл у іх механічным эквіваленце. Наша машына—гета арганізатар, выхавальнік, гета надзвычай актыўны фактар перабудовы чалавечых узаемадносін і чалавечае псіхікі. Наша машына, апрача ўсяго, гета — сімвал перамогі маладога класа, які на руінах спаганелай буржуазна-памешчыцкай культуры будуе новую гісторыю свету.

Мы не фетышызуем машыны. Мы ніколі не забываемся, што машыну робіць чалавек і машына чалавеку служыць. Але тым больш цікавы і паказальны факт, калі выраб рук чалавечых робіцца магутнай прыладай да пераробкі самога чалавека.

Эпоха класавага прыгнечання прывучыла працоўных бяцца машыны, бо машына была адным з моцных сродкаў прыгнечання. Працоўныя бачылі ў машыне свайго ворага. Наша эпоха ў корані разбурае гета гістарычнае непаразуменне, яна зближае чалавека з машынай, робіць іх блізкімі неразлучнымі прыяцелямі.

Наша калгасная вёска дала непаўторную карціну такога збліжэння чалавека з машынай.

Цяпер на кожным кроку пачуеце з вуснаў калгаснікаў поўны цёплага замілавання і гаспадарскай зайдрасці вокліч:

— Эх, каб яшчэ трактарочкаў з пару.

Такім тонам ён гаварыў некалі пра свайго ненагляднага каня, пра аснову асноў свайго комплекса хуцкага добрабыту.

Мы неяк сустрэлі на вясковай вуліцы маладую калгаснічку-брыгадзіршу, якая ехала некуды на сваіх брыгадзірскіх справах. Мы разгаманіліся з ёю і мімаволі мусілі звярнуць увагу на яе слаўнага пяцігадовага сынка, што пад час нашай гаворкі паспеў узгабацца да матчі на калёсы. Хлопец быў смелы, гаваркі, і калі мы запыталі ў яго, ці хоча ён быць брыгадзірам, ён адразу адказаў, што не хоча. Не хацеў ён быць ні старшынёй калгаса, ні нават дырэктарам МТС. І калі мы перабралі ўжо ўсё, якія ўспомнілі, кіруючыя пасады, і ён з некаторай ноткай пагарды да нашай недагадлівасці заявіў:

— Трактарыстам хачу быць, во што...

Машына ўваходзіць у дзіцячую фантазію, каб заняць сваё пачэснае месца ў яе цудоўных нязведаных садах, дзе дасоль непаўдзельна панавалі пэрыя вауські, цмокі ды іванькі-прастачкі.

А ішла машына да вёскі не ў лёгкім асыпаным кветкамі паходзе — былі сутычкі, былі баі, былі зацяжныя кампаніі.

Дырэктар МТС т. Шэлег расказваў мне цікавую эпапею барацьбы за калгас «Окцяброкая революцыя». У гетай барацьбе вырашальную ролю адыгралі машыны.

У сярэдзіне лета 1932 года ў самы разгар жніва пад уплывам кулацкай агітацыі з калгаса выйшла было пяцьдзесят гаспадарак. На полі асталося непрыбранае амаль усё чыста збожжа. Кулацкія агенты рабілі свае справу далей — яны падбівалі ўжо людзей, каб падаяліць збожжа на карані і ажаць паасобку. Яны смяяліся з рэшты калгаснікаў, якія браліся скончыць уборку сваімі сіламі. Але гета жменька адданых партыі людзей паказала, што яны ўмеюць, калі трэба, рабіць кожны за пяцёх.

Тав. Шэлег рушыў тады ў гэты калгас машыны і сам высхаў тут ды арганізаваць працу.

Работа разгарнулася шырокім напружаным размахам. Працавалі і ўдзень і ўначы, працавалі амаль без змены, бо не было каму падмяняць адзін аднаго. І ў выніку дамагліся свайго — увесь ураджай жалі і прыбралі без спазнення і без страт.

У тую-ж восень усе гаспадаркі, што выйшлі з калгаса, зноў падалі заявы аб уступленні ў калгас.

Я сёлета быў у гетым калгасе. Яны вялізнай машынай — складаная малатарняй — дамалачвалі свой ураджай. У іх добра наладжаная гаспадарка, яны атрымалі ў сярэднім па 4 кіло збожжа і 8-10 кіло бульбы на працадзень.

І ў гетым-жа калгасе пяцігадовы хлапчук горда хваліўся, што ён як вырасце, не будзе нікім іншым, а толькі трактарыстам.

6. Новы гонар новых людзей

Мне хочацца яшчэ некалькі слоў сказаць пра адну сустрэчу пра аднаго цікавага аддзіннага работніка, які можа не мае за сабой асабліва яркіх заслуг і можа акурат пра гета найбольш тыпова сабраў у сабе тое агульнае, што падымае на вышэйшую ступень увесь наш калгасны народ.

У той вёсны толькі за калгаснымі валамі пабудавалі калодзеж. Спрадвеку людзі пілі там брудную смярдзючую ваду з балота. Калі заваджаў да іх хто-небудзь са статыстыкі, яны дышпаматычна адмаўляліся, каб не даць напіцца, або прапануўвалі квасу ці малака, бо соромна было прызнацца, што цэлая вёска не здольна прыдбаць сабе калодзеж.

А вёска была дружная, працавітая. Гета былі патомкі нейкіх старадаўных перасяленцаў французаў, якія дагэтуль-дагэтуль ужо забыліся на сваю мову, на свае звычаі, але добра захавалі яшчэ відочныя адзнакі расы, знамечаныя імёны, абеларушчаныя прозвішчы і, як казаў мой новы знаёмы, дзўней, шкуль не кінулі, хадзілі ў кірху.

Да свята Окцяброкай рэвалюцыі ў гетым калгасе канчалі клуб. Калі клуба якраз мы і сустрэлі невялічкага рухавага чалавечка, шкілетка, але з яшчэ маладымі рыжымі вусікамі. Гета быў гутэйшы брыгадзір Людвік Мэта. Гаварыць пачаў ён з намі ціхім адмеранымі голасам чалавека, які за ўсё жыццё сваё прыняк гаварыць, не кідаючы працы. І ўвесь час здавалася, нібы ён кудысці спяшаецца, нібы ён прыглядаецца, каб нешта направіць, падняць, паставіць на месца.

Аб чым-бы ні гаварыў Людвік Мэта — ці аб тым, што яго брыгада нарой спраўлялася з палявымі работамі, ці аб тым, што ён яшчэ да тэрміну выканаў амаль усе абавязкі перад дзяржавай, ці аб тым, як ён падзяціцца сустрэць з сваёй брыгадай Окцяброкае свята (баранчыка прыдзецца зарэзаць, ці парсючка), — за ўсім чуваць было адно: дзядзька Людвік здаволен сваім жыццём, ён ушэўнен у ім, ён ганарыцца ім.

Гэты гонар выяўляецца часам у своеасаблівы калгасны патрыятызм — дзядзька Людвік адчувае сябе старажылам калгаснага жалу. Калі ён пачынае расказваць пра ўступленне ў іхны калгас новай брыгады з адзіласобнікаў, ён самадавольна іранізуе:

— Ужо бяруцца за работу, канечне... Прыходзілі, пыталіся, як гета коней у калгасе тіхба карэнць...

Дзядзьку Людвіка я таксама сустрэў быў на вечары знатных людзей Менскага раёна. Ён мне расказаў пра сваё цёмнае, пра свае чорнае дзяцінства. Ён расказаў, як бацька вазіў у горад кладзены лес, каб прывезці адтуль галодная сям'і булку хлеба, як дзяліла маці гэты хлеб на ўсю неалічоную іхнюю сям'ю і як страшэнна хацелася тады, каб троцінчку больш папаўся кавалачак.

Адзіны сын самога дзядзькі Людвіка вучыцца ў Менску ў тэхнікуме. Пра гета «спатомка гутэнотаў» гаворыць з радаснай неймавернасцю:

— Пусты смех часам бяра... Як успомніш сваё жыццё як падумаеш — няўжо гета мой такі ў людзей лезе?

І з глыбокай праканаласцю, з пачуццём перажытага, перабалелага дзядзька Людвік заключае:

— Галоўнае, што ніхто ніколі мае працы не бачыў. А цяпер я працую, стараюся, дык і бачаць, і паважаюць, і сам сябе чалавекам чуе...

Так, толькі ў краіне Новай Культуры, дзе творыць жыццё калгасная непераможная сіла — партыя Леніна-Сталіна, толькі ў такой краіне магла стаць найвышэйшая цэннасцю праца чалавека.

МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ

(Злева направа). 1. Ланка 2 калгаса імя Дзяржынскага, Менскага р. 2. Цэляты 9 калгаса «Новы Быт», Менскага р., 3. Жарабец «Ідэй», падорэнны С. М. Будзённым пасля «Новага быту» за добрае ўтрыманне коней. 4. Дзіцячыя яслі ў калгасе «1-е мая». Дзеці выхоўваюцца ў бягучым годзе.

За рубяжом

АБВЯРЖЭННЕ ТАСС

Расследуемыя в Харбіне паведамленні аб тым, быццам атрад Чырвонай арміі праніх на манчжурскую тэрыторыю, пабудаваў там жалеза-бетонныя ваенныя ўмацаванні і пасля гэтага быў акружан і адрэзан ад совецкай тэрыторыі мандчжурскімі войскамі і т. п., а таксама быццам совецкія самалёты рабілі палёты над гэтым мнімым совецкім умацаваннем на манчжурскай тэрыторыі—з'яўляюцца чыстейшым нымыслам, характэрным для метадаў, якімі карыстаюцца некаторыя колы ў Манчжурыі з мэтай абвастрэння совецка-японскіх адносін.

ПАДАЗРОНЫЯ МАНЕЎРЫ ЯПОНІІ ПА ПЫТАННЮ МОРСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

ТОКІО, 23 снежня. (БЕЛТА). Канкатуючы паведамленне з Лондана, што делегацыя ЗША прапануе уключыць СССР і Германію ў ліх удзельнікаў морскай канферэнцыі 1935 года, у міністэрстве замежных спраў, паводле слоў «Асахі», катэгарычна вярнуць супроць удзелу ў морскай канферэнцыі дзяржаў, якія не з'яўляюцца удзельнікамі Вашынгтонскага або лонданскага пагадненняў. Калі будзе прызнана необходным удзел СССР і Германіі ў новым морскім пагадненні, якое замяніе вашынгтонскае і лонданскае пагадненні, то, на думку міністэрства замежных спраў, трэба спачатку заключыць пагадненне пяці морскіх дзяржаў, а затым прапанаваць СССР і Германіі далучыцца да яго.

ЯПОНІЯ БУДУЕ ПОДСТУПЫ ДА ГРАНІЦ СССР

ЛОНДАН, 21 снежня. (БЕЛТА). Як паведамляе чаньчунскі карэспандэнт «Дэйлі тэлеграф», да 1931 года агульная даўжыня чыгунак Манчжурыі была 3.715 міль, а зараз 5.666 міль. Афіцыяльна прызнаюць існуючыя 11 чыгуначных ліній, адлас,—піша карэспандэнт,—паводле даных, у кужім часе павінна быць закончана яшчэ адна лінія на ўсходняй частцы Манчжоў Го, Камчатковы пуць якой даходзіць да ракі Усуры каля Хабараўска. Гэта дарога ў злучэнні з існуючай у Сальляне супроць Благавешчанска і Сялдуньскай лініі ва ўнутранай Манголіі забяспечвае магчымасць хуткіх перасоўванняў на ўсе фронты, у той час як новы выхад да навочнай Кореі, якая мяжуецца з СССР, а таксама мноства унутраных чыгуначных ліній аблягчаюць сувязь паміж самымі чыгункамі ў Манчжоў-Го і прадастаўляюць хут кі выхад у правінцыю Жэхэ.

ЯПОНІЯ РАЗАРВАЛА ВАШЫНГТОНСКАЕ ПАГАДНЕННЕ

ТОКІО, 22 снежня. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва «Сімбун Рэнгэ», сёння міністр замежных спраў Хірота тэлеграфна прапанаваў японскаму паслу Саіто паведаміць Хэлле аб разрыве Японіяй вашынгтонскага пагаднення. У ноце, якая будзе ўручана Хэллу ў бліжэйшыя дні, указваецца толькі, што «ў адпаведнасці з артыкулам 23 вашынгтонскага пагаднення Японія паведамляе ўрад ЗША аб сваім жаданні спыніць дзеянні пагаднення, і, значыць, пагадненне перастае існаваць з 31 снежня 1934 года».

НОВЫ ГАБІНЕТ У ЮГАСЛАВІІ

ВЕНА, 22 снежня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Белграда, учора ўвечары Ефіцім створан новы габінет у наступным складзе: прэм'ер міністр замежных спраў Ефіціч, ваенны міністр генерал Жыўковіч, міністр унутраных спраў былы бан (губернатар) Сараєва — Велья Пешэвіч, міністр земляробства — старшыня праўлення сербскіх «сялянскіх таварыстваў» Янковіч, міністр фінансаў — старшыня біржы ў Белградзе Стоядзіновіч, міністр гандлю і прамысловасці — старшыня саюза прамысловцаў у Загрэбе Барбаніч і рад іншых.

З членаў сучаснага габінета, апрача Ефіціча, Жыўковіча і Янковіча, ніхто не ўваходзіў у склад папярэдняга габінета. У новым габінеце — 9 сербаў, 3 харваты, 1 славенец і 1 мусульманін. 7 чалавек з'яўляюцца членамі скупшчыны (парламент), астатнія — з вышэйшых дзяржаўных чыноўнікаў. Склад новага габінета Ефіціча разглядаецца, як правал спроб стварыць «габінет шырокай канцентрацыі», у сілу чаго сам габінет будзе з'яўляцца пераходным.

У палітычных колах чакаюць, што новы габінет Ефіціча будзе праўжаць ранейшую крыўдную Францыі і Малой Антанце знешнюю палітыку; ва ўнутранай-жа палітыцы габінет будзе манеўраваць, каб захаваць і ўмацаваць сучасны ваенна-фашысцкі рэжым у Югаславіі.

ПАЛІТЫКА ФРАНЦЫІ У ГАЛІІ Е МОРСКІХ УЗБРАЕННЯЎ

ПАРЫЖ, 21 снежня. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас, міністр замежных спраў Лаваль і морскі міністр П'етры выступілі на сумесным пасяджэнні камісіі па замежных справах і морскай камісіі палаты депутатаў па пытанню аб палітыцы Францыі ў галіне морскіх узбраенняў. З выступленнямі абодвух міністраў выцякае, што Францыя спрыяча адносіцца к заключэнню морскага пагаднення, якое, аднак, павінна з'явіцца толькі асноўнай часткай усеагульнай канвенцыі па раззбраенню, прыхільнай якой яна з'яўляецца.

ЗАТРЫМАННЕ ЯПОНСКАГА АФІЦЭРА У ПАГРАНІЧНАЙ ВЁСЦЫ

ХАБАРАЎСК, 23 снежня. (БЕЛТА). 21 снежня, у 14 гадзін, у вёсцы Верхне-Нікольскай на беразе ракі Усуры, за 30 клм. на поўдзень ад горада Імана, быў затрыман японскі афіцэр з дзяншчыком-манчжурам. Яны зайшлі ў дом калгасніка в. Верхне-Нікольскае Кавеля, выграсілі вады напіцца, а затым, вышаўшы на сярэдзіну вёскі, афіцэр стаў фатаграфаць мясцовасць і салдат, разглядаўшы на зямлі шубу, наносіў на паперу заметкі. При затрыманні афіцэр назваўся падручыкам Саідзіні, а суправажаўшы яго назваўся яго дзяншчыком, манчжурскім салдатам Мамучжын. Афіцэр быў узброен шашкай і пістаметам з запаснай абоймай патронаў. Пры ім было: аддзін плёвачны фатаграфічны апарат з пяцью запаснымі каробкамі плёнкі, палявая сумка з тапаграфічнай картай совецкага і кітайскага прыкордона з японскімі надпісамі, запісная кніжка і блок-нот з заметкамі на японскай мове і т. п. Салдат быў узброен адной толькі шашкай. Па заяўленню Саідзіні, ён перайшоў граніцу нібыта ў пошуках 7-гадовага хлопчыка, які некалькі дзён перад гэтым уцёк з кітайскай фанзы супроць в. Верхне-Нікольскае і, як мяркуецца, знаходзіцца на совецкай тэрыторыі, а таксама двух манчжурскіх сялян—карейца і кітайца, якія нібыта тыдзень таму назад былі затрыманы совецкай пагранічнай аховай. У 17 гадзін японскі афіцэр быў дастаўлен на аўтамабілі ў пагранічны атрад, дзе трымаецца ў асобным пакоі, у добрых умовах. Следства праводзіцца.

ЗВОДКА АБ ХОДЗЕ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ, ПЯНЬКІ, МЯСАПАСТАВАК, ХЛЕБАЗАКУПАК, ССЫПЦЫ НАСЕННЯ І РАМОНТУ ТРАКТАРОЎ ПА БССР

на 20 снежня 1934 года

РАЁНЫ	Загатоўкі ільну	Загатоўкі пяньку	Выклад. мясапаставак	Хлебазакупак	Рамонт трактароў	Засыпана насення: нарэзных	Засыпана насення: бульбы
Менскі	112,6	106,7	89,6	104,6	17,0	91,7	121,6
Аршанскі	106,7	89,1	96,2	101,5	15,3	96,7	110,0
Сенненскі	102,0	29,9	85,6	108,6	15,1	85,2	110,8
Асіпавіцкі	126,9	101,1	95,1	106,9	33,3	100,5	—
Ч.-Слабодскі	112,1	109,0	86,6	103,7	33,3	103,5	149,4
Касцюковіцкі	105,1	101,3	83,7	103,3	14,3	84,5	128,3
Любаньскі	105,0	71,6	100,4	106,0	76,4	85,3	124,8
Старобінскі	104,3	42,5	95,7	100,9	25,0	97,1	123,2
Чашніцкі	104,3	44,2	85,6	102,0	34,6	86,2	129,1
Прапойскі	101,5	96,9	94,5	100,0	—	97,1	109,9
Віцебскі	101,1	103,8	93,2	120,8	—	91,8	101,6
Бялынічскі	100,0	56,4	94,5	100,0	44,0	78,4	123,3
Полацкі	100,1	71,1	85,8	82,5	34,5	81,2	114,6
Бабруйскі	100,8	67,6	93,0	84,4	16,6	91,3	134,7
Б.-Капылеўскі	102,2	69,0	92,7	80,0	73,9	102,4	138,3
Веткаўскі	100,1	46,7	53,6	105,7	—	91,4	126,8
Гомельскі	102,0	76,6	85,7	106,0	12,5	91,4	116,9
Мазырскі	103,1	102,9	86,7	105,8	7,9	83,4	118,1
Слуцкі	103,3	79,2	93,8	100,4	66,6	94,6	120,7
Уваравіцкі	105,5	49,2	90,4	74,7	—	55,8	98,1
Церадаўскі	102,1	100,0	85,5	81,4	51,7	95,2	123,9
Вятомльскі	106,3	111,3	86,2	104,6	29,1	87,7	108,2
Глускі	101,0	94,2	81,9	96,1	25,0	87,5	120,5
Дзяржынскі	104,5	60,0	88,7	101,9	5,2	77,5	113,3
Жыткавіцкі	100,7	90,2	91,2	85,0	—	85,8	129,2
Заслаўскі	101,2	83,0	88,0	88,2	53,8	78,8	120,2
Камарынскі	114,0	96,8	99,2	69,0	—	66,8	123,7
Клічаўскі	101,6	107,0	78,9	79,1	—	65,2	167,9
Капыльскі	103,5	101,0	88,2	89,4	68,7	90,2	—
Парыцкі	109,8	88,8	94,0	78,8	43,7	79,5	112,1
Плешчаніцкі	104,6	113,1	75,1	81,5	38,0	79,7	103,7
Смалявіцкі	106,1	100,5	86,7	100,1	86,0	72,3	138,9
Ст.-Дарожскі	100,2	50,0	91,2	91,4	48,2	95,8	103,0
Тураўскі	101,5	100,0	90,0	96,0	45,4	103,1	137,4
Удзенскі	124,0	99,0	94,4	94,2	14,2	87,9	129,4
Чачэрскі	103,1	49,0	89,1	101,1	—	54,4	116,6
Чэрыкаўскі	100,1	46,7	97,0	109,7	—	85,0	126,0
Лоеўскі	99,9	100,0	89,4	82,8	—	85,8	112,9
Дрысенскі	99,3	—	95,5	106,0	28,7	72,3	116,3
Бярэзінскі	98,5	91,0	85,9	76,4	11,1	101,6	114,9
Пухавіцкі	98,4	71,4	87,3	97,4	25,9	81,4	130,2
Лепельскі	97,3	82,7	80,4	98,2	12,5	68,8	107,2
Чэрвеньскі	96,1	150,0	81,1	72,8	44,4	98,9	129,5
Рэчыцкі	96,0	62,1	85,4	63,6	14,8	89,1	133,9
Лагойскі	95,8	106,0	89,5	90,3	90,0	78,9	121,7
Жлобінскі	95,8	80,2	86,2	89,4	45,4	93,2	99,3
Барысаўскі	95,1	100,0	79,5	99,2	12,5	92,5	129,5
Ушацкі	94,5	82,0	84,7	92,4	—	69,4	118,4
Шкловскі	94,1	44,2	85,5	69,6	22,3	88,4	124,5
Бешанковіцкі	93,7	77,1	86,0	100,0	12,9	95,0	123,3
Талачынскі	93,3	58,1	85,3	84,1	44,8	87,4	126,6
Магілеўскі	93,3	44,9	87,5	76,4	27,2	81,2	110,7
Асвейскі	93,1	—	91,4	100,0	—	87,4	153,2
Крычаўскі	92,8	77,1	90,0	108,8	—	78,1	112,2
Суражскі	92,3	78,3	92,4	78,9	24,1	83,1	123,8
Ельскі	91,5	108,8	92,9	102,3	—	86,0	111,9
Сіроцінскі	91,4	64,0	104,0	114,4	29,0	83,9	128,4
Быгінскі	91,3	94,8	92,8	84,7	—	92,5	117,9
Крупскі	90,7	94,5	80,8	87,9	25,0	79,9	108,6
Лёзненскі	89,9	44,6	89,3	106,3	11,3	83,2	119,4
Нараўлянскі	88,4	100,3	95,3	100,5	—	68,6	41,1
Гарадоцкі	87,3	100,0	86,4	91,5	14,0	93,6	113,1
Расонскі	86,4	102,5	93,9	106,3	23,1	88,0	117,6
Лельчыцкі	84,5	100,7	83,5	74,4	60,0	93,4	142,2
Быхаўскі	84,5	90,5	90,4	72,7	15,3	113,4	143,8
Петрыкаўскі	83,8	86,0	87,4	82,4	23,5	110,9	164,2
Рагачоўскі	83,6	83,1	87,0	98,2	54,5	109,5	157,0
Хойніцкі	80,1	61,8	84,7	86,6	16,6	102,6	126,8
Горацкі	80,1	43,6	90,5	95,7	65,7	69,5	122,6
Чавускі	78,6	101,0	86,6	99,9	5,0	87,4	142,9
Чырвонапольскі	77,9	46,3	85,2	84,4	—	86,1	110,9
Клімавіцкі	77,7	50,7	86,2	99,2	12,5	90,6	117,7
Кармянскі	74,8	55,0	86,4	83,3	—	92,0	123,4
Мсціслаўскі	71,4	63,6	88,8	92,3	19,0	65,7	117,1
Дубровенскі	69,3	11,2	86,1	89,5	5,1	91,1	136,0
Разам па БССР	92,5	82,9	87,9	92,6	26,3	86,0	124,2

ВЫКАНАН ФІНПЛАН IV КВАРТАЛА

ЧАШНІЦКІ раён на 7 снежня выканаў гадавы план мабілізацыі сродаў на 107,5 проц. І план IV квартала на 100,1 проц. Працяўжаецца барацьба за перавыкананне плана IV квартала.

РК КП(б)Б МАРГОЛІН.
РВК ТРЫЗНА.
Райфо ІВАНОЎ.

ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ З ХЛЕБАМ У ГОНАР З'ЕЗДА

КРУПКІ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

21 снежня пры ўрачыстай абстаноўцы адкрыўся раённы з'езд советаў.

Ад імя ЦК КП(б)В і ўрада БССР вітаў з'езд тав. Жолудаў.

З вялікай увагай з'езд выслухаў прамову делегата тав. Лапіноскага.

У гонар з'езда калгаснікі Хацюхоўскага, Халопеніцкага, Смародзінскага і іншых сельсоветаў чырвонымі абозамі прывезлі дзесяткі тон збожжа для продажу дзяржаве. Калгаснікі калгасаў «Чырвоная перамога» і «Сталінскі прызыў», Тракнаўскага сельсовета, чырвонымі абозамі здалі звыш плана ільнонасякіно.

ІВАШЫН.

ГОЛАНД

Нам. нач. Упраўлення народна-гаспадарчага ўліку БССР

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПЕРАПІСУ ЖЫВЕЛЫ ІДЗЕ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА

Праз 10 дзён па БССР пачынаецца перапіс жывёлы. Дзве акалічнасці рашаюць у асноўным поспех гэтай аперацыі, маючай агромаднае гаспадарча-палітычнае значэнне: 1) дакладны падбор палітычна правераных і тэхнічна падрыхтаваных кадраў перапісу і 2) шырокае растлумачэнне працоўным вёскі і горада мэт і задач перапісу.

Аднак, іменна ў гэтых рашаючых пытаннях у радзе раёнаў да гэтага часу праяўляецца недапушчальная бестурботнасць.

Перш за ўсё ў палучанасці недапушчальная затрымка з падборам перапіснага персанала. На 20 снежня толькі 9 раёнаў паведамілі аб поўным падборы рэгістратараў. Між тым з 20 снежня павінен быў пачацца ўжо інструктаж удзельнікаў перапісу.

Вялікія апасенні выклікае і такланасць падбору рэгістратараў. Не ўсюды яны персанальна правяраюцца і запвяраджаюцца райвыканкомамі. А Талачынскі райвыканком замест персанальнага падбору рэгістратараў вынес пастанову: «Для правядзення перапісу па сельсоветах па гаспадарках калгаснікаў, аднаасобнікаў, рабочых і служачых адказнасць усклаадзецца персанальна на сакратароў сельсоветаў».

Наогул, тэндэнцыя ўкамплектаваць склад рэгістратараў за кошт галоўным чынам, сакратароў і рахункаводаў сельсоветаў, якая нагляадзецца ў радзе раёнаў, павінна быць прызнана спробай вырашыць пытанне аб кадрах перапісу на лініі найменшага супраціўлення. Не гаворачы ўжо аб тым, што сярод сакратароў і рахункаводаў сельсоветаў нямала тэхнічна слаба падрыхтаваных, наўрад ці яны змогуць быць поўнасцю вызвалены ад работы ў сельсоветах на час правядзення перапісу. А гэта безумоўна пашкодзіць своечасоваму і добраякаснаму правядзенню перапісу. Трэба таксама падкрэсліць, што некаторыя раёны (Крупкі, Жлобін, Бабруйск і інш.) у пагоні за максімальным скарачэннем тэрмінаў перапісу (да 8-5 і менш дзён замест устаноўленых урадам 10-15 дзён) значна павялічваюць колькасць перапісных участкаў у параўнанні з устаноўленай УНХУ БССР.

У гэтым імкненні «падагнаць» перапіс крыецца значная небяспека: па-першае, наўрад ці раёны змогуць пры такой «спешцы» забяспечыць сапраўдную праверку рэгістратараў і выпраўленне недахопаў у ходзе самога перапісу; па-другое, значнае павелічэнне ліку рэгістратараў, несумненна, адмоўна адаб'ецца на іх якасным складзе.

Ужо зараз паступаюць асобныя сігналы аб спробах класава-варожых, кулацкіх элементаў выкарыстаць перапіс для сваёй падрыўной работы. Распаўсюджанне праваканыйных чутак, агітацыя за ўкрыццё, знішчанне і разбазаванне жывёлы — такія метады, да якіх ужо прыбягае і будзе, бясспрэчна, прыбягаць класавы вораг. Наўрад ці патрэбна таму даказваць выключнае значэнне, якое мае для поспеху перапісу правядзенне сапраўды шырокай, доўгай, масавай растлумачальнай работы і мабілізацыі сельсавецкага, калгаснага і гарадскога актыва для садзейнасці перапісу. Як-жа абстаіць з гэтай важнейшай старанной падрыхтоўкі перапісу?

У радзе раёнаў у гэтых адносінах намечаны перапрыемствы, якія заслугоўваюць безумоўнага ўхвалення. Так, у Клімавіцкім, як нам паведамляюць, падыёўчлом будзе праграмаслявіны дакład аб перапісе; усім сельсоветам прапанавана правесці масавыя сходы па пытанню перапісу. У Хойніцкім раёне дакład аб перапісе жывёлы ўключан у парадак дня рабселькораўскага з'езда; склікаюцца спецыяльныя нарады старшынь сельсоветаў. Па пастанове Крычаўскага РК КП(б)Б 22 і 23 снежня па ўсіх калгасах і совгасах праводзіцца адзіны палітдзень, прысвечаны перапісу. Для правядзення палітдня камандзіруецца 91 чалавек з раённага актыва. У радзе раёнаў райкомы партыі і райвыканкомы прымаюць на ўвесь час перапісу да ўсіх сельсоветаў спецыяльна для правядзення растлумачальнай работы сваіх уплаўнаважаных (Орша, Старобін, Хойнікі, Талачын, Жлобін і інш.). Аднак, не будзе перабольшаннем сказаць, што большасць раёнаў з разгортваннем падрыхтоўчай работы безумоўна спазняецца.

Вельмі неўпрыхільныя весткі прадаўжаюць паступаць аб ходзе работы па лініі райсаўнаргаса па вызначэнню пародзнасці. У большасці раёнаў гэта работа ўсё яшчэ не закончана і тэмпы незадавальняючыя.

З'яўляючыся важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніяй, перапіс разам з тым прадстаўляе сабой вельмі складаную аперацыю з арганізацыйна-тэхнічнага боку. Агромаднае значэнне маюць і такія тэхнічныя дэталі, як дакладнае ўстанаўленне перапісных участкаў, рацыянальнае размеркаванне і своечасовае забеспячэнне інструментарыем перапісу (бланкі, спісы, інструкцыі). Трэба праўда сказаць, што значная частка інспектур Наргасучота пакуль яўна незадавальняюча арганізавала гэту старанную падрыхтоўку. Небяспека тут тым большая, што іменна пытанні тэхнічнай падрыхтоўкі менш за ўсё знаходзяцца пад кантролем раённых кіруючых органаў. Нельга пры гэтым абыйсці і той факт, што да гэтага часу ад райвыканкомаў (Талачынскі, Крупскі, Смалявіцкі) упарта не выконваюць указанняў ЦК і СНК аб стварэнні нармальных умоў для работы інспектур Наргасучота (памяшканне, адапленне, тэлефоны і т. п.). У той-жа час Лёзненскі райком КП(б)Б, наперакор пастанове ЦК КП(б)Б, палічыў магчымым, у пяперашні, самы гарачы перыяд падрыхтоўкі да перапісу, адарваць раённага інспектара Наргасучота на іншую работу.

Такім чынам, паведамленні з месц аб ходзе падрыхтоўкі да перапісу жывёлы ніякіх падстаў для супакаення не пакідаюць. Да перапісу-ж асталіся лічаныя дні. Неабходна, каб раённыя камітэты партыі і раённыя выканаўчыя камітэты неадкладна і рашуча выправілі недахопы, якія ёсць зараз у падрыхтоўцы да перапісу і забяспечылі своечасовае і добраякаснае правядзенне яго.

Усебеларуская нарада архітэктараў

ЗА СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫ РЭАЛІЗМ У СОВЕЦКАЙ АРХІТЭКТУРЫ

Тав. Вайнаў у сваім дакладзе на нарадзе пераканаў цэлы рад задач, якія ўстаюць перад нашай архітэктурай.

У першую чаргу патрабуецца згуртаваць усяго архітэктурнага фронта на адзінай творчай платформе, сугучнай нашае соцыялізму. Патрабуецца ачысціць усяго архітэктурнага фронта на барацьбу за высока-мастацкую і эканамічную якасць будаўніцтва, за стварэнне твораў, вартых нашай эпохі.

На патрабную вышыню трэба паставіць справу праектавання. Тут патрабуецца суб'ёмная прапрацоўка пытанняў \ агульнадзяржаўнай сферы. Асноўнае тут заключаецца ў тым, каб усю справу прапрацавання паставіць так, каб дасягнуць паказаць работу інжынераў і дзіцяткіна, каб яны калектыўнымі сіламі праводзілі гэту работу.

Трэба змяніць усю практыку нашай работы. Праектаванне ні ў якім разе нельга адрываць ад практычнага будаўніцтва. Архітэктар павінен быць непасрэдным удзельнікам самога будаўніцтва, ён павінен адказваць за якасць будаўніцтва па яго праекту, ён павінен сачыць за выкананнем свайго праекта ў натуры. Інакш у нас могуць аказацца добрыя праекты, але дрэнна выкананыя і дрэнна афарміленыя пабудовы.

Аднак, работа архітэктуры не абмяжоўваецца толькі эканамічнай пабудовай жыллёвага, культурна-бытавога характару. Пролетарыят патрабуе належнага архітэктурнага афармлення заводаў, усяго народнага гаспадаркі, школаў, клубаў і т. д. І тут нямала работы прадстаіць нашым архітэктарам.

У першыню ў гісторыі перад'яўляе свае патрэбы да архітэктуры вёска. Нашы архітэктары толькі пачынаюць займацца гэтым пытаннем. Гэтымі дняні Наркамаем і рэдакцыяй газеты «Звязда» складзена спецыяльную нараду для абмеркавання пытанняў будаўніцтва і пытанняў калгаснай вёскі. Абмеркаванне совецкага архітэктара і інжынера — прынцып актыўны ўдзел у гэтай нарадзе.

У работах нарады разбіраючыя народы архітэктары прынялі таксама ўдзел мастакі і скульптары. Гэта не выпадкова. Мы не мыслім архітэктуру без арнаментальнай рэчкі, без пабудовы і скульптурнага барэльефамі і мазаікамі. Прадстаўнік саюза мастакоў выказаў адгучэнне на заклік тав. Вайнаў аб агульнай работе і архітэктараў і мастакоў, афарміленнем вялікай нарады і пасяджэнняў.

У заключэнні тав. Вайнаў паказаў: тав. Кагановіч у адным з сваіх выступленняў сказаў: «Пролетарыят хоча не толькі мець дамы, але мець дамы прыгожыя. Ён хоча бачыць тое, што яго гарады, яго дамы, яго архітэктура будзе больш прыгожай, чым у іншых гарадах Еўропы і Амерыкі». Давайце прадставіць так, каб выканаць гэту ўстаўленую перад намі задачу.

* * *

23 снежня на нарадзе адбыліся спрэчкі на дакладу т. Вайнаў.

У спрэчках выступілі т. т. Шэхтман, Кірыленка, Бярэзіна, Гайдзевіч, Мерэін, Мацярыцкі, Арэнштэйн і інш.

Нарада заслухала даклад т. Сурнойскага аб падрыхтоўцы да Усебеларускага з'езда архітэктараў.

Нарада паслала прывітальныя тэлеграмы таварышу СТАЛІНУ, т. т. КІРАЛО І ГАЛАДЗЕДУ.

Нарада закончыла свае работу выбраўшы часовага арганізацыйнага Усебеларускага аб'яднання архітэктараў.

ПАПРАЎКА

У мінулым у «Звязде» ад 22 снежня 1934 г. артыкуле тав. Клімковіча на яго стэнаграмы (Жарскі) дапушчана грубая памылка, якая скажае пазіцыі аўтара. На пазіцыях паслядоўнага адміністратыўнае спагнання.

Канец першага абзаца трэцяй калонкі артыкула трэба чытаць наступным чынам: «Нехабнасць работы купаюць, спады арганізаванай работы...» і т. д.

Адказны рэдактар К. ЛЕНЦНЕР.

Гарэшн. БДТ—1 Белдзяржтэатр Оперы і Балета
Тел. 24905
Мастацкі кіраўнік І. А. ГІТГАРЦ
Сёння Адкрыты спектакль
КНЯЗЬ ІГАР
Пачатак у 8 гадз. вечара.
Білеты ў касе тэатра з 12—2 і з 5—6 г. в.
Заўтра 25 снежня для школьнікаў
ЧЫРВОНЫ МАК
Балет у 3-х дзеях. муз. Глиэра
Пачатак у 5 гадз.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка"
Вялікі замежны фільм у праграме гукавы Саюзкіно-журнал
XVII Оцябр у Маскве.

Гукавы кіно-тэатр „Пролетарый"
Самая весёлая камедыя
Наследны прынц рэспублікі

Кіно „Інтэрнацыянал"
Ад 25 снежня
новая праграма

Кіно „СПАРТАК"
ЗА ШТО ЯЕ СУДЗІЛІ
(ТАМІЛІ)
драма ў 6 частках

ВКСГШБ імя ЛЕНІНА
паведамляе ўсіх прынятых студэнтаў на асноўны курс, што
заняткі пачынаюцца 13.1.35 г.
Прыём студэнтаў працягнут да 5.1.35 г.
Рэктар ВКСГШБ КАЎЛІН.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
ПРЭМ'ЕРА! ПРЭМ'ЕРА!
Рыхтуецца к выпуску музычная кіно-джаз-камедыя
ВЯСЕЛЫЯ РЭБЯТЫ
Пастаноўка і рэжысура Г. В. АЛЕКСАНДРАВА,
Вытворчасць Маскоўскага кіно-камбіната.
У карціне прымаюць удзел
Пастух Коспя—Леанід Утёсаў,
Хатняя работніца—Л. П. Орлова,
Дацця „Таргісіа"—М. Г. Стрэлкова.
Мачыха—Е. А. Цяпкіна,
Фокусьнік—Ф. Н. Курыхін.
і Марыя Іванаўна.

ПРАДАЎЖАЕЦЦА ПАДПІСКА на 1935 г.
на ўсе перыядычныя выданні выдавецтву „ОГИЗ'а"
1. Сацыяльна-эканамічныя.
2. Камсамольскія і юнацкай літаратуры.
3. Ваенныя.
4. Мастацкія.
5. Сельскагаспадарчыя.
6. Вучэбна-педагагічныя.
7. Літаратурна-мастацкія.
8. Дзіцячыя.
9. Музычныя.
10. Бібліяграфічна-медыцынскія.
11. Трансартныя.
12. Совецкае заканадаўства.
13. „Фізкультура і турызм".
14. Выяўленчых мастацтваў.
15. Крытыка-бібліяграфічн. і іншыя тэмы.
16. Па горачовай прамысловасці.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА аддзяленнямі, магазінамі, кіёскамі, упаўнаважанымі „КОГИЗ'а" і ва ўсіх паштовых пунктах БССР.
Патрабуйце праспекты і каталагі „КОГИЗ'а".
Аддзел падпісн. і перыяд. выд. Беларускага аддзялення „КОГИЗ'а".
МЕНСК, СОВЕЦКАЯ, 41-12 тел. 23—708

26 снежня г. г. у 6 гадзін вечара адбудзецца
МЕНСКІ ГАРАДСКІ ЗЛЁТ УДАРНІКАЎ ВУЧОБЫ
пачатковых школ дарослых сумесна з раённымі прадстаўнікамі, сакратарамі ячэек т-ва «ПИ» і профактывам.
Злёт адбудзецца ў клубе імя Сталіна (Інтэрнацыянальная, 11-19)
Усім настаўнікам пачатковых школ дарослых з'явіцца 24-га снежня
з 9 да 4 гадзін у памяшканне горсовета, пакой № 27 за атрыманнем мандатаў на злёт.
З сабой мець усе матэрыялы па праведзеных сходах на прадпрыемствах (насценгазеты, пратаколы, соц. умовы і т. д)
Загадчык ГарАНА КУЗНЯЦОВА.

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1935 год на БЮЛЕТЭНЬ
„НОВОСТИ ТЕХНИКИ"
орган цэнтральнага інстытута тэхніка-эканамічнай інфармацыі і сацабмену вытворчым вопытам „ЦИТЭИН-СО" Наркамцяжпрома СССР
„НОВОСТИ ТЕХНИКИ"—асвятляюць дасягненні совецкай і замежнай тэхнікі,
„НОВОСТИ ТЕХНИКИ"—у асноўным скарыстоўваюць матэрыялы замежных тэхнічных журналаў.
„НОВОСТИ ТЕХНИКИ"—у 1935 г. выходзяць у наступных спецыяльн. выданнях: машынабудаўніцтва, металургія, энергетыка, будіндустрыя, вугольная і горнарудная прамысловасць.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА КОЖНАГА ВЫДАННЯ ПААСОБНА:
(на машынабудаўніцтву—72 нумары ў год, па астатніх выданнях—па 48 нумароў у год): на 1 мес.—2 р. 40 к., 3 мес.—7 р. 20 к., 6 мес.—14 р. 40 к., 12 мес.—28 р. 80 к.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:
сектарам „быту „ЦИТЭИП-СО" НКЦП Москва, 12, Рыбный пер., 2, пом. 25) і ўсюды на пошце.

ПАСТАНОВА
Народнага камісарыята асветы БССР
22 снежня 1934 г. г. Менск.
У дадатак да загада Наркомасветы ад 21 снежня па пытанню ўмацавання ў радзе школ фізічных мер уздзеяння на вучняў загадваю:
1. Настаўнікаў Смалявіцкага раёна Драздоўскага, Чэрыкаўскага раёна—Жолубнаву і Уласаву, Заслаўскага раёна—Мацэральнік, Барысавец, Шчобята звольніць з работы і аддаць пад суд.
Прасіць пракурора рэспублікі тав. Кузьміна даць указанні следчым органам аб тэрміновым разглядзе ўсіх спраў па абвавіцэнню дзяцей у школах.
2. Заг. Заслаўскага раёна т. Дземешчыка, як і не прыняў належных мер да своечасовага рэагавання на выпадкі ўжывання мер фізічнага ўздзеяння, як спробы класава-варожых праяўленняў у совецкай школе, і лічыць не далёў да ведама НКДзеты, аб'яўляю СУРОВУЮ ВЫМОВУ.
Папярэджваю ўсіх заг. раёна, дырэктароў і заг. школ, што за непрыняцце належных мер да адпору ўсякай спробы тэрарызавання вучняў яны будуць прымгвацца да суровай адказнасці
Народны Камісар Асветы БССР ЧАРНУШЭВІЧ.

ЦСПСБ і фінсекцыя горсовета
ПРАПАНУЮЦЬ усім вылучаным таварышам для праверкі правільнасці налічэння падаходнага падатку і культзбору
закончыць праверку і прадстаўленне актаў у гарфа
НЕ ПАЗНЕЙ 25 СНЕЖНЯ,
Фабзаўмясцкомам праверыць выкананне ў вызначаны тэрмін.
ЦСПСБ, Фінсекцыя.

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы — КРУЧКОЎ, ст. рэдактар — БЯРОЗАВІК ст. метрыкі — ПЕРАКЛАДНЕЎ ст. старшыня — ПЕДЗІК, ст. друкар АН УЧЫЛА. Тыраж 35.000 Уп. Галоўлітбіта № 3—[ill